

«ПЯСНЯР» АЛЕГ ЖАЛЯЗНЯКОЎ І ЯГО СЯМ'Я

Сямейная газета

ЯК ВЫХАВАЦЬ САПРАЎДНАГА МУЖЧЫНУ?

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЖНІЎНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 153 (30033)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Развіццё сельскай гаспадаркі — адзін з найважнейшых прыярытэтаў нашай дзяржаўнай палітыкі. Доля работнікаў АПК складае 11 працэнтаў ад колькасці занятых у эканоміцы краіны. Штогод у аграпрамысловым комплексе фарміруецца каля 13 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту. Харчаванне ў агульным аб'ёме нашага экспарту займае каля 20 працэнтаў. З улікам гэтых лічбаў, думаю, зразумела, чаму такая ўвага аддаецца сельскай гаспадарцы з боку кіраўніка дзяржавы і ўрада».*

# Што пажнеш, тое і пасееш





На сельгаспрадпрыемстве «ЖодзінаАграПлемЭліта» Смалявіцкага раёна працягваецца напружанае жніво. Задзейнічана механізаванае звяно з дзевяці камбайнаў і дзевяці магутных МАЗаў для транспарціроўкі хлеба з палеткаў. А плошчаў, адведзеных пад новы ўраджай, сёлета ў гаспадарцы амаль шэсць тысяч гектараў, у тым ліку дзве тысячы — пад азімыя збожжавыя, тысяча семсот — пад кукурузу. Яравыя збожжавыя і бабовыя займаюць паўтары тысячы гектараў, а рапсавы палетак — семсот. Работа ў хлебаробаў сельгаспрадпрыемства асабліва адказная: з ураджаю, які яны збіраюць, закладваецца айчынны насенны фонд.

Камбайнера Яраслава ЦВІРКО я сфатаграфаваў на пшанічным полі каля вёскі Ялоўка. Гэта яго восьмае па ліку жніво, працуе механізатар на айчынным камбайне «Палессе-12». Ён якраз выгружаў збожжа з бункера камбайна ў самазвал.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла нараду па пытаннях удасканалення сістэмы рэгулявання цэн у Беларусі. У нарадзе ўзялі ўдзел першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў, старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў і міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў.**
- Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка прадставіў калектыву Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання новага кіраўніка Сяргея Барташа, а таксама абазначыў найважнейшыя задачы для галіны на найбліжэйшы час.
- **Камянецкі раён першы ў краіне намалаціў 100 тысяч тон збожжа.**
- У Беларусі заснавана прэмія імя Дзмітрыя Федасюка за ўклад у патрыятычнае выхаванне.


ISSN 1990 — 763X


Актуальнае інтэрв'ю

**Валерый БЕЛЬСКІ:**

## «МАХАВІК НАШАЙ ЭКАНОМІКІ БУДЗЕ РАСКРУЧВАЦЦА І ДАЛЕЙ БОЛЬШ ВЫСОКІМІ ТЭМПАМІ»

**«Працаваў слесарам брыгады па працаёмкіх працэсах у жывёлагадоўлі, служыў у Савецкай Арміі, быў галоўным эканамістам саўгаса...» Менавіта так пачынаў свой шлях наш сённяшні суразмоўца — Валерый Бельскі — намеснік Старшыні Савета Рэспублікі.**

Мы пагутарылі з Валерыем Іванавічам пра эканоміку нашай краіны, пра жыццё ў эпоху санкцый і пра барацьбу з імі, аб дружалюбных адносінах з аднымі краінамі і не зусім сумленнай палітыцы іншых. І пра што б мы ні гутарылі, тэма заўсёды плаўна перацякала ў эканамічную плоскасць. І гэта нядзіўна, бо Валерый Бельскі — доктар эканамічных навук, прафесар, да гэтага працаваў памочнікам Прэзідэнта па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы, а яшчэ раней — намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.


СТАР. 2–3


Фінансы

## АЦАНІЛІ ПЕРАВАГІ ПАДАТКУ НА ПРАФДАХОД

**Падатак на прафесійны даход уведзены ў Беларусі з 1 студзеня бягучага года. У першыя месяцы фізічныя асобы проста актыўна цікавіліся новым падатковым рэжымам, і рост колькасці плацельшчыкаў быў не вельмі вялікі.**

«Аднак цяпер іх колькасць ужо больш як 70 тысяч. Грамадзяне ацанілі перавагі такога падатковага рэжыму (выгадныя падатковыя стаўкі, падатковы вылік, простая рэгістрацыя, просты спосаб узаемадзеяння са спажыўцамі)», — сказаў на прэс-канферэнцыі **начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**

Акрамя таго, з 1 ліпеня падатак на прафесійны даход стаў абавязковым для рамеснікаў і фізічных асоб, якія вядуць дзейнасць у сферы аграэкатурызму. «Аднак рост колькасці плацельшчыкаў падатку на прафдаход назіраўся яшчэ да гэтых змяненняў», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Асноўная стаўка падатку на прафесійны даход складае дзесяць працэнтаў ад атрыманай валавой выручкі. Пры рабоце з фізічнымі асобамі або замежнымі арганізацыямі яна прымяняецца незалежна ад сумы даходу. Пры рабоце з беларускімі арганізацыямі ў межах 60 тысяч рублёў стаўка падатку складае дзесяць працэнтаў, звыш гэтай сумы — 20 працэнтаў.

Плюс дадзенай стаўкі падатку ў тым, што яна ўключае ў сябе як падатковы плацеж у бюджэт, так і адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва на пенсіённае страхаванне (не патрабуецца дадатковай выплаты ў ФСАН). А для асоб, якія атрымліваюць любы від пенсіі, стаўка падатку змяншаецца да чатырох працэнтаў.

Як растлумачыў прадстаўнік Міністэрства па падатках і зборах, у якасці дадатковых ільгот прадугледжаны падатковы вылік у памеры дзвюх тысяч рублёў. Гэта тая сума даходу, якая не абкладаецца падаткам. Іншымі словамі, падатковая база змяншаецца на названую суму. Напрыклад, плацельшчык зарабіў 500 рублёў, адпаведна, падатак выплачваць не спатрэбіцца. Калі ён заробіць суму большую за 2 тысячы, то з сумы перавышэння ён пачне плаціць падатак на прафесійны даход. Але прыведзеная льгота прымяняецца толькі для асоб, якія ўпершыню зарэгістраваліся плацельшчыкамі на названы даход.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «МАХАВІК НАШАЙ ЭКАНОМІКІ І ДАЛЕЙ БОЛЬШ ВЫСОКІМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Маё гадзіннае інтэрв'ю з ім пралецела як адно імгненне. Думаю, чытачам таксама будзе цікава.

***— Паважаны Валерый Іванавіч, на сесіі Савета Рэспублікі разглядаюцца многія пытанні, якія непасрэдна выводзяць да вызначэння эканамічнай стратэгіі развіцця Беларусі. Што цяпер у прыярытэце ў сенатараў пры разглядзе заканатворчых пытанняў, звязаных з эканомікай?***

— Абсалютны прыярытэт — прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй. Калі мы гаворым пра эканоміку, то сенатары ўцягнутыя ў актыўную работу па падрыхтоўцы заканадаўчых актаў у эканамічнай сферы. У прыватнасці, у Савеце Рэспублікі працуе экспертны савет пад кіраўніцтвам Наталлі Іванаўны Качанавай, што разглядае пераважна эканамічныя ініцыятывы, дае рэкамендацыі па павышэнні іх аб'ектыўнасці і эфектыўнасці. Гэта шмат у чым прадвызначае якасць заканадаўчага працэсу.

У ліку апошніх дакументаў, якія адобрыў Савет Рэспублікі ў эканамічнай сферы, сталі змяненні ў Банкаўскі кодэкс. Амаль тры гады працягвалася распрацоўка такога дакумента, было мноства спрэчак, адстойваліся розныя пазіцыі. Гэта вельмі важна, таму што кожны з нас так ці інакш узаемадзейнічае з банкаўскімі структурамі, іншымі фінансавымі інстытутамі. Рэзанансна́й нормай стала ўрэгуляванне парадку прымянення санкцый да атрымальніка крэдыту. Па сутнасці адбылося абмежаванне штрафаў банкаў па крэдытах, што папярэдзіць злоўжыванні.

Удакладнена заканадаўства ў сферы архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці, у тым ліку з мэтай зніжэння ўзровень бюракратычных працэдур пры ажыццяўленні будаўніцтва аб'ектаў. Павышана адказнасць усіх удзельнікаў дадзенага працэсу, уключаючы праекціроўшчыкаў і наглядныя структуры.

Пастаянна ўдасканальваецца працоўнае заканадаўства. Сёння ў нас ёсць магчымасць ажыццяўлення працоўнай дзейнасці ў дыстанцыйнай форме. Прынятыя нормы, якія дазваляюць работніку заключаць працоўны дагавор без асабістага ўдзелу. Гэта дасць магчымасць прымяняць сучасныя, адаптыўныя падыходы, лягчэй будзе знайсці работу і выконваць яе без з'яўлення ў офісе. Дадзены падыход павысіць канкурэнтаздольнасць IT-кампаній, а таксама ён з'яўляецца камфортным для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, і асоб з інваліднасцю.

Быў прыняты Закон «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці». У адпаведнасці з патрабаваннямі Прэзідэнта нашай краіны, удакладнены механізмы захавання тых прадпрыемстваў, якія часова апынуліся ў цяжкай фінансавай сітуацыі, на мяжы банкруцтва. Прынятыя рашэнні дазваляюць падтрымаць працоўныя калектывы. Павышаецца роля мясцовых выканаўчых органаў у згаданым працэсе.

**«Мы — краіна з адкрытай эканомікай, таму нам для нармальнага існавання і развіцця трэба актыўна гандляваць на знешніх рынках».**

***— Кіраўнік дзяржавы нядаўна адзначыў, што «эканоміка — гэта аснова. Будзе эканоміка — усё астатняе мы вырашым». Ці можна сказаць, што ў першым паўгоддзі айчынная эканоміка паказала ўстойлівы рост? Якія галіны ўжо паспяхова спраўляюцца з санкцыйным ціскам, а дзе трэба будзе яшчэ старанна папрацаваць?***

— Так, безумоўна, мы ведаем, што за паўгоддзе наша эканоміка прырасла на 2 %. Пакуль мы можам казаць аб аднаўленчым росце, таму што мінулы год завяршыўся падзеннем вытворчасці дабаўленай вартасці. Скарачэнне адбылося праз санкцыйны ціск на нашу краіну і на гандлёвых партнёраў.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Трэба было пэўны час адаптавацца да сітуацыі.

Адзначу, што адаптацыя прайшла досыць хутка і эфектыўна. І рост, які назіраецца, — толькі пачатак. Махавік эканомікі будзе раскручвацца і далей больш высокімі тэмпамі. Ёсць усе падставы для таго, каб большасць планаў, якія намечаны на бягучы год, была выканана. Залогам гэтаму павінен стаць рост экспарту.

Мы — краіна з адкрытай эканомікай, таму нам для нармальнага існавання і развіцця трэба актыўна гандляваць на знешніх рынках.

**«Вядома, важна працаваць над нармалізацыяй узаемадзеяння з нашымі партнёрамі (у мінулым), якія адмовіліся ад супрацоўніцтва. Мы заўсёды гатовыя абмяркоўваць перспектывы, але не прымаем ціск. Паступіцца сваімі каштоўнасцямі, традыцыямі, сваім суверэнітэтам, сваімі брацкімі адносінамі з Расіяй — гэтага не будзе ніколі».**

Як вы ведаеце, асноўны санкцыйны ўдар прыйшоўся па нашых знешнегандлёвых пазіцыях, але цяпер экспарт б'е рэкорды. Урад працуе ў антыкрызісным рэжыме, ва ўзаемадзеянні з урадам Расійскай Федэрацыі. Кіраўнікамі нашых дзяржаў пастаўлена задача па фарміраванні агульнага эканамічнага плана. На маю думку, гэта вельмі своечасовае рашэнне. Ва ўмовах мабілізацыйнага характару функцыянавання эканомікі без такога рашэння немагчыма эфектыўна рухацца далей.

Чаму кіраўнік дзяржавы робіць акцэнт на тым? Таму што і нашы сацыяльныя дасягненні, і дабрабыт у цэлым, і ваеннае будаўніцтва, рэалізацыя інфраструктурных праектаў сацыяльнага характару забяспечваюцца рэсурсамі, якія прадуцыруе эканамічная сфера.

Пенсіённае забеспячэнне як яскравы прыклад: не будуць паступаць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва — не будзе пенсій, перастануць выконвацца амбіцыйныя планы ў сферы аховы здароўя. І ўсё астатняе.

***— На шматгаліновай выставе, прысвечанай навуковым, прамысловым і іншым дасягненням, прымеркаванай да X Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі, які праходзіў ва Уфе, каля стэндаў з беларускімі таварамі былі літаральна натоўпы людзей. Чаму шыльда «Зроблена ў Беларусі» мае высокую спажывецкую вагу на прасторах суседняй дзяржавы?***

— Сам юбілейны Форум рэгіёнаў, які праходзіў ва Уфе, аказаўся вельмі прадукцыйным і эфектыўным з пункту гледжання камерцыйных кантрактаў і наладжвання дзелавых сувязяў. Карыстаючыся выпадкам, я хацеў бы выказаць словы падзякі кіраўнікам абласцей і Мінскага гарвыканкама, якія ўзялі асабісты ўдзел у мерапрыемстве, кіраўніцтву Савета Федэрацыі Расіі і Рэспублікі Башкартастан, якія забяспечылі поспех мерапрыемства.

Адным з праектаў форуму была шматгаліновая выстава. У ёй актыўна ўдзельнічалі нашы айчынныя прадпрыемствы, якія прадставілі сваю прадукцыю. У тым ліку былі арганізаваны народныя падворкі, якія, з аднаго боку, дэманстравалі нашы дасягненні, а з другога — прадстаўлялі самабытную культуру Беларусі.

У выставе ўжо традыцыйна ўзяло ўдзел каля 60 суб'ектаў гаспадарання нашай краіны. Гэта прадпрыемствы Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта, арганізацыі харчовай і лёгкай прамысловасці, машынабудаўнічага комплексу. Асабліва ўпадабалі мясцовыя жыхары і госці Уфы вырабы лёгкай прамысловасці. Усяго ў рабоце форуму было задзейнічана амаль пяць тысяч чалавек.

Дык чым жа беларуская прадукцыя вылучаецца сярод іншых вытворцаў? У першую чаргу гэта аптымальныя суадносіны цаны і якасці. Якасць — перш за ўсё. Другое — маркетынгавая палітыка. Яна ў нас сумленная. Напэўна, кожны спажывец, нават на бытавым узроўні, ведае, што набыць тавар у некаторых вытворцаў (з гучнымі імёнамі), той жа аўтамабіль, можна за параўнальна невялікія грошы, а вось абслугоўваць яго абыдзецца ўжо ўтрая даражэй.

**«Навукаёмістае дзяржаўнае фармацэўтычнае прадпрыемства "Акадэмфарм" сёння цесна супрацоўнічае з індыйскай кампаніяй, якая дзеліцца з намі сваім вопытам».**

Нашы ж прадпрыемствы ўжываюць збалансаваную палітыку продажаў, што вельмі падабаецца спажыўцам. У беларускіх машын за каробку перадач пры рамонце не давядзецца выкладваць з кішэні траціну той сумы, якую ўладальнік заплаціў за ўвесь аўтамабіль.

***— Адзін з ключавых стэндаў беларускай экспазіцыі на выставе быў прысвечаны Міністэрству прамысловасці, дзе прадстаўлены перадавыя прадпрыемствы Беларусі. Якія сучасныя мадэлі айчыннай тэхнікі карыстаюцца заслужанай павагай расійскіх спажыўцоў?***

— Гэта бытавая тэхніка, аўтобусы, велікагрузы і многае іншае.

Наш сталічны трактарны завод ведаюць усе спецыялісты. У некаторых рэгіёнах Расіі да 70 % трактарнага парку складаюць менавіта нашы машыны. А цяпер, пасля таго як многія «наеліся» заходніх рашэнняў па рамонце (дакладней — па нерамонце. — **С. К.**) імпартнай тэхнікі, з улікам хітрага маркетынгу, санкцый, цікавасць да беларускай тэхнікі ўзрасла ў разы.

Мы павінны па максімуме выкарыстаць момант для ўзмацнення сваіх пазіцый на рынку. Нам трэба працягваць наладжваць яшчэ больш цесныя кантакты з пакупнікамі, абапіраючыся на тэхнічныя вартасці, забяспечваючы фінансавы сэрвіс, якаснае і апаратыўнае тэхнічнае абслугоўванне.

Прыемна парадавалі водгукі аб беларускіх камбайнах, і не толькі ў Расіі. Я асабіста пабываў у Казахстане, дзе мы наведвалі аграрны ўніверсітэт у Алма-Аце. Водгукі аб нашых камбайнах былі проста цудоўныя, аж да таго, што для Казахстана няма камбайна лепшага за беларускі, зыходзячы з рамонтапрыдатнасці, кошту, якасці абмалоту збожжа і, што не малаважна, хуткасці навучання асоб, якія яго эксплуатуюць і абслугоўваюць.

**«Другое пытанне рэзерваў росту ляжыць у даванні роўнага доступу да магчымасцяў узаемнага карыстання інструментамі падтрымкі, якія прымяняюцца сёння на тэрыторыях нашых краін. Гэта значыць, беларускія прадпрыемствы, што працуюць у інтарэсах Расіі, павінны атрымаць магчымасць выкарыстання сістэмы падтрымкі дзейнасці ў Расійскай Федэрацыі, а расійскія суб'екты гаспадарання павінны мець магчымасць карыстацца такімі механізмамі ў Рэспубліцы Беларусь».**

***— Цяпер мы пераарыентавалі нашу эканоміку на рынкі дружалюбных краін. Самая блізкая для нас — Расія. Ужо вядома, што нашы краіны па выніках года пакажуць рост. Узаемны гадавы тавараабарот складае 43,7 мільярда долараў, а з улікам аказання паслуг — амаль 45 мільярдаў долараў. Дзе, на ваш погляд, тут рэзервы росту?***

— Наша супрацоўніцтва ва ўмовах санкцыйнага ціску развіваецца на аснове ўзаемнага інтарэсу. Аспекты, на якія звяртаюць увагу нашы прадпрыемствы, знаходзяцца не толькі ў гандлёва-эканамічнай плоскасці. Суперважная сёння рэалізацыя кааперацыйных праектаў, і ўрады Беларусі і Расіі разумеюць тое. З улікам кампетэнцый на тэрыторыі нашых краін ствараюцца ўзаемадапаўняльныя вытворчасці, якія функцыяніруюць як адзіны вытворчы комплекс. А гэта паглыбляе гандаль і робіць яго прадказальным і надзейным.

Таму першы рэзерв нашага эканамічнага супрацоўніцтва — кааперацыя. І тут не толькі вядомыя праекты, якія знаходзяцца ў полі зроку, але і іншыя, у сферы супрацоўніцтва малых і сярэдніх прадпрыемстваў.

Другое пытанне рэзерваў росту ляжыць у даванні роўнага доступу да магчымасцяў узаемнага карыстання інструментамі падтрымкі, якія прымяняюцца сёння на тэрыторыях нашых краін. Гэта значыць, беларускія прадпрыемствы, што працуюць у інтарэсах Расіі, павінны атрымаць магчымасць выкарыстання сістэмы падтрымкі дзейнасці ў Расійскай Федэрацыі, а расійскія суб'екты гаспадарання павінны мець магчымасць карыстацца такімі механізмамі ў Рэспубліцы Беларусь. Згаданыя пытанні да канца пакуль не ўрэгуляваны, але дыялог на такую тэму працягваецца.

***— Вы мелі рацыю, калі казалі, што дружалюбныя адносіны ўключаюць эканамічны складнік. З якімі яшчэ дзяржавамі ў нас выбудаваліся сапраўды моцныя і ўзаемавыгадныя адносіны?***

# БУДЗЕ РАСКРУЧВАЦЦА ТЭМПАМІ»

— Наш традыцыйны стратэгічны партнёр, таварыш і сябар — Кітайская Народная Рэспубліка. Кітай аказвае нам вялікую дапамогу і ў эканоміцы, і ў развіцці сацыяльнай сферы. Аказвае ён у тым ліку і тэхнічную дапамогу. За кітайскія сродкі будуюцца два буйныя аб'екты — стадыён і басейн. Гэтыя будынкі знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці.

Калі казаць пра лічбы, то экспарт Беларусі ў Кітай за паўгода ўжо склаў тую ж велічыню, якая была летась за 12 месяцаў. Таму мы можам разлічваць, калі трэнды захаваюцца, тады па выніках бягучага года выйдзем на параметр у два мільярды долараў.

Кітай застаецца адным з найбуйнейшых інвестараў нашай эканомікі. Ён дапамагае нам з развіццём таваправоднай сеткі і развівае найбуйнейшы беларуска-кітайскі праект — Індустрыяльны парк «Вялікі камень». Гэты парк, нягледзячы на санкцыі, пастаянна набывае новых рэзідэнтаў, растуць інвестыцыі ў сферу.

Базай нашага супрацоўніцтва з'яўляецца і калектыўны сябар — краіны Еўразійскай эканамічнай прасторы. Разам з імі мы выбудоўваем асновы адзінай эканамічнай палітыкі. Праўда, тут таксама апошнім часам бываюць праблемы. Партнёры адчуваюць цяпер велізарны ціск як на палітычным, так і на эканамічным узроўнях з мэтай перашкодзіць нашым кантактам.

У апошні час актыўна развіваюцца кантакты з афрыканскімі краінамі. Паступова такі трэнд набірае сілу.

Блізкі Усход заўсёды прыцягваў нашу ўвагу. Яшчэ ў савецкі час было моцнае сяброўства паміж намі і арабскімі дзяржавамі, краінамі Блізкага Усходу ў цэлым, Індыяй і Іранам. І цяпер нашы сувязі працягваюць развівацца, напаўняюцца новым зместам. Апошняму спрыяюць памкненні Беларусі па далучэнні да ШАС і ў супрацоўніцтве з БРІКС. Гэта значыць, Іран, Турцыя, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Саудаўская Аравія і Сірыя — усе гэтыя краіны для нас блізкія, яны адказваюць нам узаемнасцю на прапановы аб супрацоўніцтве і падтрымліваюць такое супрацоўніцтва. Яно разнастайнае. Напрыклад, навукаёмістае дзяржаўнае фармацэўтычнае прадпрыемства «Акадэмфарм» сёння цесна супрацоўнічае з індыйскай кампаніяй, якая дзеліцца з намі сваім вопытам.

**«Наша інстытуцыянальная матрыца такая, што дадзены аспект мае важнае значэнне для арганізацыі любых кантактаў — палітычных, эканамічных, сацыяльных і гуманітарных. І гэта, мяркую, гарантыя выканання абавязацельстваў. Часам поціск рукі варты больш, чым дзесяць падпісаных дакументаў».**

Прыведзеныя адносіны маюць не проста камерцыйную базу, але, у нашых традыцыях, заснаваныя на асабістай дружбе паміж заснавальнікамі і менеджментам, спецыялістамі і навукоўцамі. Наша інстытуцыянальная матрыца такая, што дадзены аспект мае важнае значэнне для арганізацыі любых кантактаў — палітычных, эканамічных, сацыяльных і гуманітарных. І гэта, мяркую, гарантыя выканання абавязацельстваў. Часам поціск рукі варты больш, чым дзесяць падпісаных дакументаў.

***— Раней вы казалі, што наша краіна падвяргаецца гібрыднаму ціску. Што нам трэба будзе рабіць цяпер, каб не страціць самабытнасць і не знізіць эканамічны дабрабыт сваіх грамадзян?***

— Усе прынцыповыя рашэнні ўжо прынятыя кіраўніком дзяржавы. Дадзены дадатковыя паўнамоцтвы ўраду. Прэзідэнт нашай краіны здзейсніў знакавыя візіты ў Іран і Зімбабвэ, якія з'яўляюцца асновай для працягу эканамічных кантактаў у рэгіёнах.

Вядома, важна працаваць над нармалізацыяй узаемадзеяння з нашымі партнёрамі (у мінулым), якія адмовіліся ад супрацоўніцтва. Мы заўсёды гатовыя абмяркоўваць перспектывы, але не прымаем ціск. Паступіцца сваімі каштоўнасцямі, традыцыямі, сваім суверэнітэтам, сваімі брацкімі адносінамі з Расіяй — гэтага не будзе ніколі.

Калі хтосьці хоча з намі супрацоўнічаць, ён павінен тое ўлічваць. Гэта наша прынцыповая пазіцыя. Яна выразна агучана і даведзена да нашых партнёраў. Цяпер мяч на іх баку.

**«Сёння многія нашы замежныя партнёрскія адносіны замарожаны. З іншага боку, шэраг кампаній знаходзіцца «на нізкім старце» — яны чакаюць аслаблення санкцый, каб зноў з намі супрацоўнічаць, нават на лепшых для нас умовах, чым да крызіснай сітуацыі».**

Наша краіна заўсёды была адданая захаванню ўсіх дагавораў, якія цяпер парушаюцца (увядзеннем санкцый — **С. К.**) нашымі суседзямі і краінамі калектыўнага Захаду. Але ціск у нас не праходзіць. Мір і дабрабыт, якія ёсць у нашага народа, — за іх заплачана занадта высокая цана. Таму разменьвацца на нейкія дробныя ўступкі мы дакладна не будзем. Усе павінны тое дакладна ведаць. Хочуць з намі супрацоўнічаць — без праблем, але як роўныя.

Дарэчы, ёсць рэйтынг краін, спрыяльных для міграцыі. Адно з міжнародных агенцтваў паставіла нас у топ-10, на 8-е месца. І гэта нягледзячы на ціск, на санкцыйныя абмежаванні, уведзеныя супраць нашай краіны. Тут улічваліся эканамічныя паказчыкі, сацыяльныя дасягненні, тое, што краіна мае дастаткова надзейную базу для вядзення бізнесу.

***— Беларусь і Расія сумесна рэалізоўваюць новыя праекты па кааперацыі і імпартазамяшчэнні. Якія распрацоўкі, на ваш погляд, найбольш перспектыўныя па дадзеных напрамках?***

— Я б тут зрабіў акцэнт на дасягненнях тэхналагічнага суверэнітэту. Гаворка ідзе пра вытворчасць прамысловага абсталявання, то-бок пра машыны, якія робяць машыны. Гэта ў першую чаргу.

У апошні час на фоне глабалізацыі эканамічных сувязяў мы трапілі ў эканамічную залежнасць ад шэрагу краін. У нармальнай сітуацыі нічога страшнага ў тым няма. Некаторыя буйныя кампаніі, напрыклад, вытворцы кавальскага абсталявання, фарміравалі свае кампетэнцыі больш за сто гадоў. Таму ставіць перад сабой самамэту — стварыць нейкі прэс — не мела сэнсу. Яго можна было купіць. Цяпер нас сумесна з Расійскай Федэрацыяй абмяжоўваюць у гэтым. Мы павінны замясціць нішу з дапамогай стварэння ўласнага абсталявання. Таму — машыны, якія вырабляюць машыны. Вось задача нумар адзін.

Другой задачай павінна стаць аднаўленне кампетэнцый і вытворчасць мікраэлектронных кампанентаў. Мы тут не ўнікальныя — падобная задача стаіць і ў Кітая, дзе ажыццяўляецца праграма, якая накіравана на пашырэнне вытворчасці мікраэлектронікі і сыход ад залежнасці ад ЗША ды іншых краін, якія пастаўляюць чыпы.

Дастаткова востра стаіць пытанне імпартазамяшчэння асобных кампанентаў пры стварэнні нашай тэхнікі. Холдынг «Амкадор» адзін з першых трапіў пад санкцыі. Там у надзвычайным рэжыме была наладжана падрыхтоўка канструктарскай і тэхналагічнай дакументацыі па замяшчэнні асобных вузлоў, якія пастуналі з-за мяжы.

Найбольш яскравы прыклад — вытворчасць харвестарных галовак, якія вырабляюцца адзінкавымі прадпрыемствамі ў свеце. У свой час пэўная тэхніка «Амкадора» стаяла амаль гатовая да адпраўкі, ёй не хапала толькі гэтых дэталяў. Цяпер тыя механізмы вырабляюцца на нашай базе.

Таксама неабходнае імпартазамяшчэнне праграмнага забеспячэння. Мы сутыкаемся з абсалютна неразумнымі рашэннямі нашых былых партнёраў. У прыватнасці, гаворка ідзе аб незабеспячэнні софту, які выкарыстоўваецца ў глабальнай фінансавай сферы для правядзення разлікаў, арганізацыі спецыфічнага ўліку пэўных аперацый у банкаўскай сферы. Гэты софт вырабляецца некалькімі кампаніямі ў свеце. Цяпер яны адмаўляюцца ад супрацоўніцтва, і нам даводзіцца ствараць яго самім у кааперацыі з Расійскай Федэрацыяй.

Так, санкцыі адчувальныя для нас. Чвэрць нашай эканомікі непасрэдна трапіла пад абмежаванні, яшчэ чвэрць — пацярпела ўскосна. Фінансавая сфера падверглася (у той час — **С. К.**) неймавернаму ціску.

Але мы выдатна разумеем, што няма ніводнага тавару, які немагчыма вырабіць у Расіі ці ў нашай краіне. Пытанне толькі ў часе і сродках, якія неабходна выдаткаваць. Напрыклад, Беларусь вырабляе элементы спадарожнікаў, Расійская Федэрацыя — атамныя рэактары новага пакалення. Некаторых тэхналогій, у поўнай меры, няма нават у ЗША. Няўжо мы не можам зрабіць лінію па вытворчасці сыру? Можам!

Нядаўна стала вядома, што Францыя прымае рашэнне аб адмове ад паставак кампанентаў свайму найбліжэйшаму саюзніку — ЗША — для атамнай энергетыкі. Сітуацыя з абмежавальнымі мерамі аказалася заразнай. Спачатку ўсе яны змагаліся з ворагамі, лічачы імі нас і РФ, цяпер яны перайшлі да проціборства са сваімі партнёрамі.

Думаю, мы выйдзем з сітуацыі мацнейшыя, больш незалежныя і з горда паднятай галавой, што немалаважна для нашага народа. Для нас не пустым словам з'яўляецца самапавага. Як настройвае Прэзідэнт, не трэба прагінацца, не ўсё вызначаецца грашыма.

Ад тых рашэнняў, якія прымае наша кіраўніцтва, залежыць не толькі дабрабыт грамадзян, але і суверэнітэт як вечная каштоўнасць.

Я ўпэўнены, што мы з сітуацыі выйдзем вельмі дастойна. Міжнародны аўтарытэт Беларусі будзе толькі ўмацоўвацца і дасць нам шмат дывідэндаў, уключаючы эканамічную сферу. Сёння многія нашы замежныя партнёрскія адносіны замарожаны. З іншага боку, шэраг кампаній знаходзіцца «на нізкім старце» — яны чакаюць аслаблення санкцый, каб зноў з намі супрацоўнічаць, нават на лепшых для нас умовах, чым да крызіснай сітуацыі. Палітыка, якая рэалізоўваецца ў нашай краіне, адаптыўная, улічвае інтарэсы патэнцыяльных інвестараў. Ім падабаецца жыць і працаваць тут. Пры гэтым патэнцыял паляпшэння дзелавога клімату далёка не вычарпаны.

***— На якой стадыі цяпер ажыццяўляецца рэалізацыя сумеснага праекта «Падтрымка намаганняў Рэспублікі Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця (МУР)»?***

— Усе рашэнні па рэалізацыі і напаўненні дадзенага праекта прынятыя. Сёння праводзяцца неабходныя арганізацыйныя працэдуры для прызначэння асоб, адказных за распараджэнне фінансавымі рэсурсамі. У хуткім часе гэтыя працэдуры будуць завершаны. Мы ўвесь час трымаем пытанне на кантролі.

У цэлым у нас склалася добрае ўзаемадзеянне са структурамі ААН, але, на жаль, многія донары міжнароднай тэхнічнай дапамогі, у якіх па-ранейшаму мае патрэбу Беларусь, у першую чаргу ў сувязі з перададоленнем наступстваў аварыі на ЧАЭС, ад нас адвярнуліся.

У верасні адбудзецца саміт па МУР у Нью-Ёрку. Мы да яго актыўна рыхтуемся. Будзем гаварыць аб праблемах, якія перашкаджаюць рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця ў свеце ў сувязі з санкцыйнай палітыкай асобных дзяржаў, што супярэчыць міжнародным прававым нормам.

***Гутарыў Сяргей КУРКАЧ.***

## Па сутнасці

# ЖНІВЕНЬ, ЯКІ ЗМЯНІЎ СВЕТ



Як той казаў: імкнешся змяніць свет — пачні з сябе. З нас і пачалося. Да дабрабыту ў хаце — прызвычаіліся. Людзі сярэдняга ўзросту неяк забыліся пра крымінал і галечу: да добрага хутка прывыкаеш. Вядома, імкненне да лепшага — залог развіцця. Але ж «лепшае» — гэта не толькі шыкоўнае аўто альбо жыллёвая плошча. Гэта яшчэ і нястомная работа над сабой. А ўзбагачаць свой унутраны свет альбо адточваць фізічную форму ў Беларусі — даступна. Аднак жа чамусьці імкнуліся да «заходняй карцінкі», не разумеючы, што яна нятанна каштуе для кожнага падаткаплацельшчыка. І людзі, якія не вельмі разбіраліся ў паліттэхналогіях, а яшчэ менш — у эканоміцы, наш сацыяльна арыентаваны лакаматыў хацелі накіраваць на рэйкі капіталізму.

Безумоўна, капіталісты аб тым і марылі. Але Лукашэнка ім замінае стаць уладарамі багацццяў і заводаў краіны. Але большасці якая ў тым цікавасць? А ў гэтым і «невераГоднасць»: патрабавалі таго, што ім потым атруціла б звыклае жыццё. Яшчэ адна акалічнасць, якую выкрыў 2020-ы. З часткі нашага грамадства выхавалі «касмапалітаў» і спажыўцоў. Некаторыя думалі, што «лідары» пратэсту змогуць ператварыць іх штодзённае жыццё ў «заморскі адпачынак». Дарэчы, людзі працы, асабліва цяжкай і вельмі неабходнай краіне, «пэрамэн» не патрабавалі. Яны шчыравалі на палетках і на заводскіх канвеерах. Калі звычайны абывацель разважае пра Еўропу, то мае на ўвазе раскошу, не ведаючы, што яна для многіх еўрапейцаў проста недасягальная, і не разумеючы таго, што гэтае «свята жыцця» барэлеўскага «саду» аплачанае стагоддзямі каланіялізму ды прыгнёту народаў і цэлых кантынентаў.

Жнівеньскія падзеі 2020-га сталі дабрадзейным дажджом, які змыў з цнатлівага цела Беларусі заходні мэйкап. Не інвестыцыі і сучасныя тэхналогіі. Імі яны так і не падзяліліся. Усе гэтыя дзесяцігоддзі калектыўны Захад — нібы ланцугі і кайданы — навязваў нам сваю палітычную сістэму, жадаючыператварыць сістэму ўлады ў піраміду падпарадкавання заходнім «сюзэранам», грамадства — разбэсціць, інстытут сям'і — дыскрэдытаваць.

Беларусь выстаяла. Гэта стала прэцэдэнтам у геапалітыцы. І маяком для большасці краін свету. А што, так можна было? Гегемоніі калектыўнага Захаду Мінск даў адпор. Зразумела, адчуваючы падтрымку Расіі. Але калі б Беларусь не выстаяла, то фронт быў бы не на сотні, а на тысячы кіламетраў. Гэта ў палітычным і ваенным сэнсах. Беларусь, афіцыйны Мінск, Лукашэнка зрабілі тое, пра што марылі іншыя. Далі бой. Беларусь не здрадзіла сабе, таму свет і насамрэч цяпер іншы. Які і павінен быць. Розныя краіны і роўныя краіны.

Ну, як там напісана ў нашага класіка: не спыніць, не стрымаць. Наступленне беларускай мадэлі развіцця. Нібыта той самабытны зубр на сваіх прасторах. Памыліўся заходні функцыянер: мы не «джунглі», мы — Пушча. А яшчэ Гусоўскі папярэджваў натхнёнага еўрапейскага чытача: трапіш у Пушчу — лепш не гнявіць яе ўладара. Але хто ў той Еўропе цяпер чытае кнігі, калі нават сваю класіку яны адмянілі? І хто на тым Захадзе сёння робіць высновы? Але ад гэтага гістарычныя працэсы не спыняюцца. Беларускі жнівень 2020-га змяніў геапалітыку. Сапраўды парушыў падмуркі старога свету.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Прынята дэкларацыя патрыятычных сіл краіны

**На пасяджэнні штаба патрыятычных сіл Рэспублікі Беларусь на базе Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску прынята абноўленая дэкларацыя патрыятычных сіл, паведамляе БелТА.**

Тэкст дэкларацыі зачытаў **старшыня Беларускай партыі «Белая Русь», старшыня РГА «Белая Русь», член Савета Рэспублікі Алег РАМАНАЎ.**

«Год таму мы сабраліся на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы і прынялі першую сумесную дэкларацыю. З задавальненнем адзначаем, што яе пункты выконваюцца як самімі ўдзельнікамі таго форуму, так і органамі дзяржаўнай улады. За мінулы час былі прыняты законы аб Усебеларускім народным сходзе, аб грамадзянскай супольнасці, аб палітычных партыях. У Беларусі паслядоўна ажыццяўляецца ўдасканаленне палітычнай сістэмы. А гэта ўмацоўвае нашу незалежнасць і суверэнітэт», — гаворыцца ў дэкларацыі.

Ужо зусім хутка Беларусь уступіць у пару сур'ёзных выбарчых кампаній. «У лютым 2024 года чакаюцца выбары ў Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, мясцовыя Саветы, будзе сфарміраваны састаў Усебеларускага народнага сходу. А ў 2025 годзе пройдуць прэзідэнцкія выбары. Мы ўсведамляем, што ў любым грамадстве палітычнае жыццё непазбежна суправаджаецца канкурэнцыяй, сутыкненнем поглядаў і ідэй, барацьбой за галасы выбаршчыкаў. Адначасова ўсе мы зацікаўлены, каб гэты працэс праходзіў у цывілізаваный форме, не вёў да расколу грамадства, а садзейнічаў яго паступальнаму руху наперад», — падкрэсліваецца ў дэкларацыі.

У сувязі з гэтым грамадска-палітычныя сілы Беларусі пацвярджаюць сваю прыхільнасць да наступных прынцыпаў, якімі будуць кіравацца ў далейшай дзейнасці, у тым ліку ў перадвыбарны перыяд. «Незалежнасць і суверэнітэт з'яўляюцца непарушнай асновай нашага разумення дзяржаўнасці. Канстытуцыя ў рэдакцыі, ухваленай на ўсенародным рэферэндуме 27 лютага 2022 года, вызначае агульнапрызнаныя рамкі айчыннай мадэлі развіцця. Дасягненні перыяду прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі задаюць вектар развіцця нашай краіны на многія гады наперад. Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца свяшчэннымі сімваламі, якія аб'ядноўваюць увесь народ. Беларусь захоўвае вернасць сваім абавязацельствам у Саюзнай дзяржаве, заснаваным на разуменні агульнасці шляху ўсходнеславянскіх народаў, нягледзячы на ўсе нягоды і выпрабаванні. Палітычнае жыццё павінна будавацца ў ключы адкрытай дыскусіі па актуальных грамадска значных пытаннях. Брудныя палітычныя тэхналогіі недапушчальныя падчас выбарчых кампаній, яны супярэчаць самому разуменню грамадскага ладу, уласцівага беларусам. Любое замежнае ўмяшанне ва ўнутрыпалітычныя працэсы краіны з'яўляецца злачынным і павінна цалкам выключацца. Партыі, а таксама асобныя кандыдаты, якія ўдзельнічаюць у выбарах, у сваіх палітычных праграмах павінны кіравацца найперш агульнанацыянальнымі інтарэсамі, не разменьваючы іх на імгненныя прыватныя разлікі. Распальванне якой бы там ні было варожасці ўнутры беларускага грамадства непрымальнае», — адзначаецца ў дэкларацыі.

«Перакананы, што ўсе мы, народ Рэспублікі Беларусь, дастойна пройдзем адказны палітычны перыяд і прадэманструем усяму свету сваю высокую грамадзянскую культуру, прыхільнасць нормам сапраўднага народаўладдзя», — падкрэсліваецца ў дэкларацыі.

Жніво-2023

# «ХЛЕБ НЕ ЛЮБІЦЬ АЗАРТУ»

## Гродзенскі камбайнер намалаціў рэкордныя чатыры тысячы тон

**І гэта не першы высокі паказчык Алега БАНДАРЭВІЧА з СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна. Вопытны хлебароб неаднойчы выходзіў пераможцам спаборніцтва на залатых палетках. Яго філасофія простая і, як аказалася на практыцы, самая дзейсная: працуй — і будзе вынік!**



Звычайна размова з механізатара няпроста, асабліва падчас уборачнай кампаніі. Ды і што можна даведацца за кароткі прамежак часу на палях, калі гутарка доўжыцца некалькі хвілін? А больш і не атрымаецца, бо тут, што называецца, кожнае імгненне працуе на ўраджай. І ўсё ж на гэты раз мне пашанцавала. Не таму, што размова была працяглай. Проста суразмоўнік аказаўся надзвычай адкрытым чалавекам і пастараўся данесці сваё бачанне хлебаробскай справы. Мабыць, таму, што з гэтай справай у Алега Бандарэвіча звязанае ўсё свядомае жыццё. Сёлетняя ўборачная кампанія — не выключэнне.

Мы пад'ехалі да камбайна ў тую самую хвіліну, калі механізатары вярнуліся з абеду. З гэтага і пачалася наша гаворка.

— Падсілкаваліся даволі смачнай ежай. На абед быў гарохавы суп, вельмі смачны, не толькі мы любім такі суп, але і Прэзідэнт таксама. На другое — ячная каша з мясной падліўкай, гарбата і бутэлька мінеральнай вады. Будзе яшчэ вячэра, — падтрымаў размову Алег Вітольдавіч.

У гэтыя дні ён заняты на ўборцы пшаніцы. Асаблівых праблем няма — ураджай добры, не палеглы, як летась. Найбольш складаным аказалася жніво на палетках азімага ячменю, бо разам са спелым коласам пачаў прарастаць новы, зялёны. Нават тэхніцы было складана разабрацца ў такіх акалічнасцях.

— Камбайн разумны, але не разумнейшы за чалавека. І хоць тут настроена адпаведная праграма, я бачу, што ў бункер павінна сыпацца зерне чыстае, не бітае, без каласоў, таму гэта трэба карэкціраваць, — заўважае ён і тут жа ўглядаецца ў хмару, што наплывае на неба. — Дождж нам не сябар цяпер, бо мокры колас пачынае чарнець, таму стараемся як мага хутчэй яго ўбраць.

Працоўны дзень у камбайнера доўгі. На поле выходзіць а 6 гадзіне раніцы, а дамоў, бывае, што і апоўначы толькі трапляе. На вёсцы доўга спаць не атрымаецца. Магчыма, гэта адзін з мінусаў работы ў сельскай гаспадарцы. Але нямала і плюсоў. Па словах майго суразмоўніка, вёска — гэта прастор, жывая прырода, свая сядзіба. Пра тое, што звязаў жыццё з калгасам, ніколі не шкадаваў.

Вось ужо чвэрць стагоддзя Алег Бандарэвіч шчыруе на збожжавых палетках. Сваёй работай і заробкамі задаволены. Яно і нядзіўна. СВК імя Дзеншчыкова — адзін з кітоў аграпрамысловага комплексу Гродзеншчыны. Сёлета тут набылі высокатэхналагічны камбайн, на якім цяпер і працуе герой публікацыі. Хоць і на больш старой тэхніцы дабіваўся высокіх вынікаў. Летась яго асабісты рэкорд быў 3,6 тысячы тон. Амаль штогод ён у ліку прызёраў па намалоце не толькі ў гаспадарцы, але і ў раёне і вобласці. Тры разы быў на рэспубліканскіх «Дажынках», на якіх Прэзідэнт уручаў тэлевізар, халадзільнік.

На новым камбайне намалот днямі склаў чатыры тысячы тон. Гэта не толькі асабісты рэкорд Алега Бандарэвіча, але і рэкордны намалот у краіне. Ці будзе ўзятая планка ў пяць тысяч тон, ён не загадвае. Усё прыйдзе сваім парадкам, лічыць суразмоўнік. Хоць гонар за дасягнутыя поспехі, вядома, ёсць. Лідарам жніва ганарацца і сямейнікі, пастаянна тэлефануюць, цікавяцца, як справы. А можа, падштурхоўваюць да новых рэкордаў?

Нягледзячы на тое, што па жыцці Алег Вітольдавіч — чалавек азартны, на палях гэтага не дапускае. Гонкі, на яго думку, тут быць не павінна. Хлеб гэтага не любіць.

— Планку сваю імкнуся трымаць, але не любой цаной. Уборка павінна праходзіць у спакойным, ураўнаважаным стане. Намалоты прыйдуць самі, калі тэхніка добрая, ураджай высокі. Зразумейце, што не толькі ад мяне залежаць высокія намалоты, а ў першую чаргу ад аграномічнай службы, якая падрыхтавала глебу, насенне, калі выконваюцца ўсе агратэхнічныя параметры. Вось складнікі, якія працуюць на высокі ўраджай, а ўжо наша задача — забраць яго з палёў. Зноў жа, зрабіць тое трэба таксама з галавой. Лётаць па полі на злом галавы, як той казаў, — не ў гэтым выпадку. Хлеб любіць спакойнага падыходу, руплівага і ў той жа час разважлівага. Трэба глядзець, каб не было страт, назіраць за вільгаццю. Той, хто будзе рабіць стаўку толькі на хуткасць, высокіх намалотаў не дасягне, а страты на палях могуць быць вялікія. Таму рытм павінен быць спакойны і разам з тым напружаны, — раскрыў стратэгію свайго поспеху лідар жніва.

З гэтага вынікае і жыццёвы дэвіз камбайнера. Ён даволі просты: «Працуй — і будзе вынік!». Добрая справа не застаецца без увагі, калі чалавек стараецца, імкнецца прынесці карысць гаспадарцы, у яго таксама будуць і добрыя заробкі, і павага. А яшчэ Алег Бандарэвіч не любіць называць сябе камбайнерам, а кажа: «Я — хлебароб». Я сказала б яшчэ: «Хлебароб. З вялікай літары».

Па словах **галоўнага агранома СВК імя Дзеншчыкова Валерыя ШЫНТАРА,** у гаспадарцы нямала вопытных работнікаў, якія працуюць на высокім узроўні. Як удаецца захаваць касцяк?

— Гэта тое пакаленне, якое адказна ставіцца да работы, руплівае за гаспадарку. Многае трымаецца менавіта на іх. Ёсць і таленавітая моладзь, праўда, яе не так шмат, хацелася б, каб было больш, — акцэнтуе ўвагу спецыяліст.

Што датычыцца вытворчых паказчыкаў, у гаспадарцы ўбрана звыш 80 % плошчы збожжавых і зернебабовых, намалочана каля 25 тысяч тон зерня. Мяркуюць сабраць больш, чым летась. Сёлета спрыяльныя ўмовы для азімых культур, ураджайнасць якіх перавысіла 100 ц/га. Гэта звязана з мяккай зімой, плюс добрая сістэма ўгнаенняў і аховы раслін.

Сёлета парадаваў таксама азімы рапс з рэкорднымі ўраджайнасцю і валавым зборам. У гаспадарцы ёсць свой цэх перапрацоўкі, дзе атрымліваюць рапсавы алей і макуху для кармлення жывёлагадоўчага статка. Раслінаводства працуе на жывёлагадоўлю, якая дае асноўны прыбытак гаспадарцы.

— СВК імя Дзеншчыкова займае ў краіне лідзіруючыя пазіцыі па малаку ўжо шмат гадоў, — дадае **старшыня прафкама гаспадаркі Святлана АХОТНІК.** — Людзі трымаюцца за нас, мы, у сваю чаргу, стараемся забяспечыць іх належнымі ўмовамі працы, добрым харчаваннем, якасныя спецвопраткай. У нас усяго гэтага хапае. Самае галоўнае — бяспека людзей.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Краіны басейна Амазонкі дамовіліся стварыць альянс па барацьбе са стратай лесу



Удзельнікі саміту Арганізацыі Дагавора аб супрацоўніцтве ў басейне ракі Амазонка дамовіліся стварыць альянс па барацьбе са стратай лесу. Пра гэта гаворыцца ў іх сумеснай заяве, паведаміла ТАСС. Краіны паставілі перад сабой мэту садзейнічаць рэалізацыі мер па барацьбе з незаконнай высечкай лесу і пажарамі, а таксама прыкладаць намаганні па стварэнні «фінансавых і нефінансавых стымулаў для захавання лясоў». Акрамя таго, удзельнікі саміту заклікалі развітыя краіны «выканаць свае абавязацельствы па выдзяленні сродкаў» для барацьбы са змяненнем клімату і падтрымаць краіны, якія сталі на шлях развіцця. Дзяржавы Амазоніі таксама адзначылі неабходнасць «прасоўвання інавацыйных механізмаў фінансавання дзейнняў па барацьбе са змяненнем клімату, у тым ліку абмену развітымі краінамі доўгу на кліматычныя праекты».

## У Індыі зафіксаваны новы штам COVID-19

Індыйскі кансорцыум па геноміцы COVID-19 заявіў, што ў краіне выяўлена некалькі выпадкаў заражэння новым штамам ковіду. Аб гэтым са спасылкай на індыйскую газету Economic Times паведаміла РІА «Навіны». Новаму штаму далі назву Eris. Устаноўлена, што ўтварыўся ён ад Omicron. Раней новы падварыянт віруса знайшлі ў Вялікабрытаніі. Навукоўцы выказваюць турботу заклапочанасць з нагоды хуткасці распаўсюджвання штама Eris. Паводле даных Міністэрства аховы здароўя Індыі, было выяўлена 54 новых носьбіты Eris на працягу сутак. Такім чынам, колькасць хворых на новы штам каранавіруса па ўсёй краіне перавысіла 1,5 тысячы чалавек. Былы кіраўнік кансорцыума і старшыня кансультатыўнай групы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па эвалюцыі вірусаў Анураг Агравал паведаміў, што такое павелічэнне захварэльнасці будзе адбывацца перыядычна. Гэта звязана са зніжэннем імунітэту і мутацыямі віруса.

## На поўначы Еўропы з-за штормаў закрылі паромныя пераправы

Моцны вецер і лівні абрынуліся на Нарвегію, Швецыю, Фінляндыю, паведамілі еўрапейскія СМІ. Штармавое надвор'е прывяло да закрыцця паромных пераправаў, затаплення вуліц і дарог. Вецер зносіў дахі дамоў, паваленыя дрэвы. У Осла жыхароў заклікалі не выходзіць на вуліцу без вострай неабходнасці і працаваць з дому. У нарвежскім Упраўленні водных рэсурсаў і энергетыкі папярэдзілі аб «надзвычай моцных дажджах» на поўдні краіны і неабходнасці «адмовіцца ад неабавязковых паездак» з-за пагрозы паводак. У Фінляндыі таксама даручылі работадаўцам ацаніць неабходнасць паездак работнікаў у офісы і па магчымасці дазволіць ім працаваць з дому. У цэнтральнай частцы Швецыі аб'явілі павышаны — «чырвоны» — узровень небяспекі з-за лівяў, якія прывялі да ўзняцця ўзроўню рэк.

Сямейная газета
Выпуск № 14 (217)

## СПРАВА ДАРОСЛЫХ

**МЕНАВІТА летам часцей, чым у іншы час, гінуць дзеці. Трагедыі адбываюцца ў вадзе, на дарозе, у агні... І як ні папярэджваюць перад пачаткам школьных канікулаў ратавальнікі, якую прафілактычную работу не вядуць іншыя кампетэнтныя органы, з году ў год няшчасных выпадкаў пазбегнуць не ўдаецца...**

*Толькі за два летнія месяцы на вадаёмах краіны сёлета загінулі дзевяць непаўналетніх — дзевяць будучых мам і татаў, дзевяць патэнцыяльных студэнтаў і выпускнікоў, прафесіяналаў, а галоўнае — любімых дзяцей...*

*Вядома, горш за ўсіх адчуваюць сябе бацькі. Кожны з іх шукае ў тым, што здарылася, сваю віну — па статыстыцы, у большасці трагічных выпадкаў дзеці, якія тонуць, адпачываюць на вадаёмах увогуле без прысутнасці дарослых. Скажаце, урок тым, хто пускае непаўналетніх адных да ракі ці возера? Магчыма. Хоць ці ўсе бацькі або іншыя сваякі, адказныя за іх на летні перыяд, дакладна ведаюць, чым у пэўны прамежак часу занятыя іх дзеці, унукі, пляменнікі?*

*Як расказвае наш сусед, які нарадзіўся і вырас у сельскай мясцовасці, яго бацькі толькі ў падлеткавым узросце сына даведаліся, што той умее плаваць. Андрэй, як высветлілася, навучыўся плаваць яшчэ ў пяць гадоў — таемна ад бацькоў яны з сябрамі-аднагодкамі не раз выпрабоўвалі свае сілы на мясцовым вадаёме. Добра, што ўсе заплывы добра заканчваліся. Я і сама практычна кожны летні дзень у дзяцінстве праводзіла каля вады. Калі была зусім малая, хадзілі туды з мамай. Ужо падлеткам з дазволу дарослых шпацыравала да ракі ці возера з сяброўкамі. Але ці ўмела добра плаваць? Не. Нават цяпер не ўпэўненая ў сваіх сілах: люблю плаваць там, дзе ў любы момант можна адчуць дно.*

*З таго часу нічога не змянілася. Адным дзецям дазволена самастойна знаходзіцца на вадаёмах. Іншыя ходзяць туды цішком. Кантраляваць іх, вядома, трэба. Але, на мой погляд, яшчэ больш важна навучыць сваіх дзяцей плаваць. І калі здарыцца так, што ваша паслухмянае дзіця, якое ніколі нікуды без дазволу не сыходзіла, раптам акажацца без суправаджэння дарослых каля вадаёма, яно будзе паводзіць сябе ў вадзе ўпэўнена.*

*На жаль, забірае дзіцячыя жыцці не толькі вада, а і агонь. Безумоўна, здараюцца трагічныя выпадкі, прадугледзець якія надзвычай складана, амаль немагчыма. Аднак многіх трагедый, як паказвае следства, усё ж можна было пазбегнуць. Напрыклад, калі б гаспадары прыватных дамоў рэгулярна правяралі свае печы (калі яны ёсць), кантралявалі спраўнасць праводкі і — што зусім не патрабуе ні траты часу, ні вялікіх грашовых намаганняў — устанавілі ў кожным пакоі пажарны апавяшчальнік. Такая рэкамендацыя актуальная і для гарадскіх кватэр.*

*Між іншым, сучасныя новабудоўлі здаюцца з пажарнымі апавяшчальнікамі ў пакоях. Многія лічаць, што гэтыя невялікія ўстройствы псуюць інтэр'ер, і спяшаюцца іх зняць, безумоўна, не думаючы ў той час пра бяспеку. Паклапаціліся сённяшнія забудоўшчыкі і яшчэ пра адзін момант: вокны ў сучасных кватэрах устаноўліваюцца з замкамі. Усе ключыкі лёгка дастаюцца і хаваюцца. Свядомым бацькам не варта баяцца, што дзіця самастойна адчыніць акно — зрабіць так у яго проста не атрымаецца. Калі вокны такім дэвайсам не абсталяваныя, гэта лёгка выпраўляецца.*

*Павышанай увагі бацькоў юных удзельнікаў дарожнага руху або пасажыраў патрабуюць і дарогі. Калі ўстаноўлена заканадаўствам перавозіць дзіця ў спецыяльным крэсле і прышпільваць яго, то так і патрэбна рабіць. Нават калі вы плануеце праехаць зусім няшмат (напрыклад, з крамы да дому або з адной вёскі ў іншую), ніхто не ведае, што ў гэты час можа здарыцца на дарозе. І калі ўжо набываеце сваім дзецям веласіпеды або самакаты, навучыце нашчадкаў правілам паводзін на дарозе.*

*Бяспека кожнага дзіцяці — у руках яго бацькоў. Вядома, настане час, калі вы не зможаце быць заўсёды побач. Таму прадугледзьце ўсе магчымыя сітуацыі і навучыце сваіх дзяцей элементарным правілам бяспекі, паводзін у пазаштатных выпадках. Няхай ім ніколі не спатрэбіцца іх прымяняць, затое вашы дзеці будуць ведаць, як дзейнічаць, каб яшчэ адна трагедыя не папоўніла сумную статыстыку.*

**Вераніка КАНЮТА.**

Тыя, хто побач

«Пясняр» Алег ЖАЛЕЗНЯКОЎ:

# «КАЛІ ЗБІРАЕЦЦА ЎСЯ СЯМ'Я, УСВЕДАМЛЯЮ, ШТО ЎЖО ДЗЯДУЛЯ»

**ВОСЬ ужо дваццаць гадоў Алег Жалезнякоў — адзін з самых пазнавальных музыкантаў у БДА «Песняры». Менавіта ён выконвае тыя песні, якія некалі былі ў рэпертуары заснавальніка легендарнага беларускага ансамбля — народнага артыста БССР і СССР Уладзіміра Мулявіна. Вядома, ёсць у рэпертуары Алега і новыя песні, створаныя ўжо іншым пакаленнем «Песняроў» і ім самім як кампазітарам. Але каб «пераспяваць» Мулявіна, патрэбна асаблівая музычная смеласць. А чым напоўненае жыццё артыста пасля канцэртаў? «Сям'ёй», — імгненна, не задумваючыся, адказвае Алег, які прыйшоў на інтэрв'ю разам са сваёй жонкай Ірынай.**

***— Пачнём з нашага традыцыйнага пытання: як вы пазнаёміліся?***

**Алег Жалезнякоў (А. Ж.):** — На дыскатэцы, гэта таксама было такое традыцыйнае месца знаёмства моладзі ў 1990-я гады. Інтуіцыя падказала, што ў Іры ёсць цікавасць да музыкі, таму запрасіў яе на рэпетыцыю свайго рок-гурта «Ром».

**Ірына Жалезнякова (І. Ж.):** — Алег мне падаўся сімпатычным хлопцам. Менавіта пасля рэпетыцыі мы сталі больш кантактаваць. І ведаеце, музыка адыграла не апошнюю ролю ў тым, што паміж намі, як прынята казаць, прабегла тая самая іскра, з якой разгараецца каханне. Гэта не значыць, што закахалася ў музыканта, ва ўвесь гэты сцэнічны антураж, не. Перш за ўсё я ўбачыла цікавага чалавека, які займаецца любімай справай.

***— А ваша прафесія, Ірына, далёкая ад музыкі?***



Алег і Ірына з сынамі Антонам і Валодзем, дачкой Янінай.

**І. Ж.:** — Я — эканаміст, мне падабаецца мая прафесія, і ў нейкай ступені нават лічу яе творчай.

***— Ці доўгі быў перыяд заляцанняў і чым ён запомніўся?***

**А. Ж.:** — Ды неяк хутка мы яго прайшлі. У асноўным ён быў напоўнены музыкай. Цяжка ў гэта паверыць, але мы ўжо 30 гадоў разам.

***— А чаму цяжка?***

**А. Ж.:** — Напэўна, таму што жыццё хуткаплыннае. Мы адчуваем сябе ўсё тымі ж маладымі людзьмі, якім усё цікава, лёгкімі на пад'ём. І толькі калі збіраецца ўся сям'я, усведамляю, што ўжо дзядуля. Нашай унучцы тры годзікі, і гэта вялізнае шчасце і цуд!

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

Бацькоўскі клуб

# МУЖЧЫНСКАЕ ВЫХАВАННЕ

### Каб вырасціць талковага сына, трэба і самому быць «рукастым» і «галавастым»...

**У нас з жонкай трое дзяцей. Дзве дзяўчыны, якім за 20, і малодшы хлопец, якому 15. Дачок я любіў і люблю, але ж... У свой час мы разам збіралі ягады ў лесе, я вучыў іх месці падлогу і мыць посуд. На сваім прыкладзе паказваў дзяўчатам, што ў сям'і ўсе роўныя, таму, акрамя правоў, усе маюць абавязкі. Аднак з часам дзявочыя сакрэты, свае мары яны сталі хутчэй раскрываць маме. Сітуацыя кардынальна змянілася, калі ў нашай сям'і з'явіўся маленькі чалавечак мужчынскага полу.**

## Спорт як механізм развіцця духу

Мяркуючы па дзіцячых фотаздымках, я быў самы маленькі ў класе. Самы худзенькі і самы слабенькі. Таму мой бацька аддаў мяне ў першым класе ў спартыўную секцыю па дзюдо. Да дзясятага класа я падрос, але ўсё роўна заставаўся самым маленькім, затое далёка не самым слабым. Школа дзюдо зрабіла з мяне сапраўднага байца. Дагэтуль захаваўся бронзавы медаль за трэцяе месца ў рэспубліцы.

Гэты медаль я паказаў свайму сыну... На жаль, яго ў спартыўную секцыю я так і не аддаў (былі істотныя праблемы са здароўем). Але ў нас з ім выпрацавалася звычка рабіць



невялікую прабежку (каля двух кіламетраў) у суботу і ў нядзелю. А яшчэ каля дома ёсць цудоўная спартыўная пляцоўка, дзе шмат разнастайных трэнажораў і нават сілавых комплексаў. Зімой спартыўнай пляцоўкай становіцца тэрыторыя нашай кватэры. Невялікі набор гантэляў і эластычнай гумы, шведская сценка і ўсё. Не, не ўсё — яшчэ ровары. У нас іх дома цэлых два. Больш у кватэру не змяшчаецца.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

# «Не перашкаджайце дзецям прыходзіць да Мяне...»

## Як расказаць малому пра Бога?

**КОЖНЫ з бацькоў спадзяецца, што сын або дачка вырасце гарманічнай асобай, развітой інтэлектуальна, духоўна, фізічна. Заўважым, што духоўнае развіццё дзіцяці не менш важнае, чым інтэлектуальнае і фізічнае, бо без унутранай апоры ў сучасным свеце чалавек уразлівы. Як пазнаёміць дзіця з хрысціянскім светапоглядам? Як расказаць яму пра Бога і ў якім узросце можна пачынаць чытаць Біблію? Прыслухаемся да парад святара — настаяцеля храма свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, айца Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.**



### Дакрануцца да душы

***— Агульнавядомая цытата з Евангелля: «Не перашкаджайце дзецям прыходзіць да Мяне, бо іх ёсць Царства Нябеснае». У якім узросце варта ўпершыню пагаварыць з дзіцем пра Бога? Калі можна пачынаць рэлігійнае выхаванне?***

— Я не вызначаў бы нейкі канкрэтны ўзрост малога, калі прыходзіць час далучаць яго да веры. Да духоўнага ўздзеяння дзіця ўспрымальнае з нараджэння. Мы пачынаем далучаць яго да духоўнасці праз малітву: трымаем на руках, звяртаючыся да Бога, і словы малітвы дакранаюцца да душы малога. Таму і існуе практыка хрышчэння дзіцяці задоўга да яго свядомага ўзросту.

***— Але ж прынята лічыць, што доўгі час пасля з'яўлення на свет дзіця мае патрэбу толькі ў знешнім доглядзе, і гадоў да двух-трох яго розум яшчэ не здольны да засваення духоўных ісцін...***

— Вядома ж, гэта памылка. Ва ўзаемадзеянні на духоўным узроўні малы мае патрэбу з самага пачатку жыцця. Душа дзіцяці чыстая і больш успрымальная да праяў духоўнага свету, чым душа дарослага. І, пераканаены, не варта пераносіць пачатак яго духоўнага развіцця на нейкі нявызначаны тэрмін. Маліцеся з дзіцем на руках, бярыце малога з сабой у храм літаральна з першых месяцаў яго жыцця — гэта і стане для яго пер-

**«Важна растлумачыць дзіцяці, што Бог — Айцец Нябесны, які любіць нас. Не той, хто карае або асуджае, не суддзя. Гэта любячы Айцец, які клапоціцца аб кожным».**

шым далучэннем да Бога.

***— Падрастаючы, дзіця пачынае задаваць пытанні, у тым ліку і аб веры. Як расказаць малому пра Бога? Пачаць расказваць біблейскія гісторыі як казку або адразу ставіць перад ім глыбокія і сур'ёзныя пытанні, якія ўздымае Святое Пісанне?***

— Як толькі дзіця гатовае ўспрымаць інфармацыю, трэба паступова, пачынаючы з найбольш простых ісцін, адкрываць для яго Святое Пісанне. У сучасных бацькоў шмат магчымасцяў далучыць дзіця да хрысціянства. Але прасцей за ўсё зрабіць тое праз добрыя, мудрыя кнігі. І найперш гэта, вядома, Біблія, якая дае прамыя адказы на складаныя пытанні. Мае самыя яркія ўражанні дзяцінства звязаныя з чытаннем дзіцячай Біблії. Гэтыя вобразы, неверагодна глыбокія і ў той жа час вельмі простыя і зразумелыя, з ранняга ўзросту запалі мне ў душу. Цяпер вельмі шмат дзіцячай праваслаўнай літаратуры. Выдаецца дзіцячая Біблія, невялікія па аб'ёме кніжкі з асобнымі біблейскімі сюжэтамі ў выкладанні для дзяцей, дзіцячыя малітвасловы — з іх дапамогай дзіця можа навучыцца маліцца. Але тут важна памятаць: калі бацькі жадаюць гадаваць дзіця ў праваслаўі, ім самім важна пачаць будаваць сваё жыццё ў адпаведнасці з запаведзямі і менавіта да гэтага прыкласці максімум намаганняў.

### «Выхаванне пачніце з сябе»

***— Калі дзіця расце ў хрысціянскай сям'і, вера натуральным чынам уваходзіць у яго свядомасць. Але вельмі часта бацькі бываюць у храме толькі на вялікія царкоўныя святы, пры гэтым усё ж лічаць сябе праваслаўнымі і хочуць, каб сын або дачка таксама ўспрынялі веру. Што вы ім параіце?***

— Адна з цяжкасцяў у дачыненні да духоўнага выхавання дзіцяці якраз і заключаецца ў тым, што праваслаўнае выхаванне павінна быць звязанае са штодзённым жыццём і светапоглядам бацькоў. Вера не зводзіцца толькі да наведвання храма, да традыцый і абрадаў. Гэта лад жыцця, мысленне чалавека. Хрысціянства — тое, з чым хрысціянін прачынаецца раніцай, праводзіць увесь дзень і кладзецца спаць. Немагчыма быць хрысціянінам толькі па царкоўных святах. Вера — гэта тое, як чалавек бачыць сябе, Бога і навакольных людзей кожны дзень і кожную гадзіну. Праваслаўе павінна прысутнічаць у штодзённым, бытавым жыцці сям'і, тады не будзе «падзелу», калі з аднаго боку мы спрабуем дзіця нечаму навучыць, з другога — дэманструем яму глыбокую супярэчнасць паміж тым, чаму вучым, і тым, як рэальна паступаем і што гаворым.

***— То-бок толькі словамі выхаваць немагчыма?***

— Цалкам дакладна. Чалавека фарміруе асяроддзе, дзе ён расце. Таму асабісты прыклад значна важнейшы за словы: гэта і ёсць выхаванне — той уплыў, які мы можам аказаць на дзіця. Ці маем права мы чагосьці патрабаваць ад дзіцяці, калі самі гэтага не выконваем? Асабісты прыклад дае магчымасць заваяваць той самы бацькоўскі аўтарытэт, аб адсутнасці якога сёння кажуць і педагогі, і псіхолагі. Рабіце так, як хацелі б, каб паступала ваша дзіця, — тады натуральным чынам у сям'і сфарміруецца асяроддзе, каштоўнасці якога ўбяруць дзеці.



***— Якія памылкі звычайна дапускаюць бацькі, расказваючы дзіцяці пра Бога? Як гэтых памылак пазбегнуць? Напрыклад, як зрабіць так, каб малы не ўспрымаў Бога занадта спрошчана — як чараўніка, які робіць падарункі (такі перакос у свядомасці сучасных дзяцей адбываецца даволі часта)? З іншага боку, грозная найвышэйшая сіла, якая карае за свавольствы, — гэта ж таксама няправільная трактоўка Бога ў дзіцячай свядомасці...***

— Я б параіў бацькам пачаць з таго, што Бог — гэта Айцец, бо ў малітве мы звяртаемся да Яго «Ойча наш». Важна растлумачыць дзіцяці, што Бог — Айцец Нябесны, які любіць нас. Не той, хто карае або асуджае, не суддзя. Гэта любячы Айцец, які клапоціцца аб кожным. Вось асноўная канцэпцыя, якую трэба ўкласці ў душу юнага чалавека. І самая, на мой погляд, сур'ёзная бацькоўская памылка — пагражаць дзіцяці гневам Божым. Гэта недапушчальна. Разам з дзіцем бацькі павінны імкнуцца да Бога. Нярэдка, на жаль, усё адбываецца зусім не так. Ведаю сям'ю, дзе маці і тата адпраўляюць дзяцей у храм, а самі не прыходзяць. Бачу, што дзеці прыйшлі ў царкву і «адстойваюць» службу — круцяцца на лаўцы і чакаюць яе заканчэння. Бацькі ж лічаць, што ў царкве без іх удзелу з іх дзяцей выгадуюць добрых людзей. Але гэта так не працуе. Праз такія бацькоўскія памылкі дзеці бачаць разыходжанне ў сям'і паміж словамі і справамі і перастаюць імкнуцца рабіць крокі насустрач Богу. Менавіта ў духоўным выхаванні неверагодна важнае пытанне ўнутранай адпаведнасці. Калі бацькі завышаюць планку для свайго дзіцяці, але самі не імкнуцца дацягнуцца да яе, выніку не будзе.

### «Не замест, а разам...»

***— Ці магчыма перакласці духоўнае выхаванне дзіцяці, скажам так, «на прафесіяналаў» — можа быць, дастаткова проста запісаць сына або дачку ў нядзельную школу?***

**«Хрысціянства — тое, з чым хрысціянін прачынаецца раніцай, праводзіць увесь дзень і кладзецца спаць. Немагчыма быць хрысціянінам толькі па царкоўных святах».**

— Як я ўжо казаў, гэта вялікая праблема, калі бацькі лічаць, што замест іх іхніх дзяцей зможа выхаваць Царква. Не замест, а разам — гэта вельмі важны аспект. Нядзельная школа, праваслаўныя класы агульнаадукацыйнай школы — усё гэта вельмі карысна і каштоўна, і Царква праводзіць вялікую работу ў дадзеным кірунку. Арганізоўваюцца паездкі і экскурсіі, дзіцячыя гурткі і нават спартыўныя секцыі пры прыходах. Дзеці і падлеткі могуць сустрэць аднагодкаў, зносіны з якімі будуць уплываць на іх станоўча. Яны атрымліваюць магчымасць сфарміраваць сваё бяспечнае, добразычлівае кола зносін, але пачынаецца духоўнае выхаванне павінна ўсё ж такі з сям'і. І адна з самых распаўсюджаных бацькоўскіх памылак, якія я назіраў, — падмена глыбокага рэлігійнага пачуцця вонкавымі формамі: рытуаламі і абрадамі. Усе вонкавыя рэлігійныя формы духоўнага жыцця павінны быць выяўленнем

**«Мае самыя яркія ўражанні дзяцінства звязаныя з чытаннем дзіцячай Біблії. Гэтыя вобразы, неверагодна глыбокія і ў той жа час вельмі простыя і зразумелыя, з ранняга ўзросту запалі мне ў душу».**

і вынікам унутраных перажыванняў, вашай веры. Мы, бацькі, павінны пачынаць з пытанняў да саміх сабе: як я стаўлюся да Бога, да сябе, да іншых людзей? Таму што можна бездакорна прытрымлівацца ўсіх царкоўных традыцый і рытуалаў, але ўнутрана заставацца халодным і адчужаным. Дзіця тое абавязкова адчуе. Каб вернікі маглі правільна разумець сэнс таго, што адбываецца ў царкве, святары і праводзяць перад таінствамі і абрадамі гутаркі. І, выхоўваючы дзіця ў праваслаўі, пачынаць трэба найперш з выхавання сябе саміх. Дадам, што яшчэ адна глыбокая памылка — весці з дзецьмі гаворку пра Бога толькі ў сувязі з рэдкімі вялікімі царкоўнымі святамі, такімі як Вялікдзень або Каляды. Для гутарак аб веры з дзіцем не патрэбныя спецыяльныя нагоды. Сваю веру бацькі павінны адлюстроўваць праз учынкі, справы, штодзённае жыццё: паказваць прыклад хрысціянскага стаўлення адно да аднаго ў сям'і, з іншымі людзьмі. Але, вядома, святы — таксама выдатная магчымасць яшчэ раз закрануць такую тэму.

***— Мы ўжо казалі пра гэта ў нашай рубрыцы, але давайце яшчэ раз вернемся да распаўсюджанай пазіцыі сучасных бацькоў: «Вырасце — сам вырашыць, як і ў каго яму верыць». Чым такая пазіцыя можа быць небяспечная?***

— Можа здарыцца так, што калі дзіця вырасце, яму не будзе на што абаперціся. Пагадзіцеся, вельмі важна, каб ужо да падлеткавага ўзросту ў юнага чалавека было дакладнае разуменне таго, што такое добра і зло, што такое грэх і якую шкоду ён можа нанесці і самому чалавеку, і навакольным. Таму разам з фізічным і інтэлектуальным удасканаленнем вельмі важна закладваць у сваё дзіця і духоўныя асновы. З самага ранняга дзяцінства, на мой погляд, неабходна перадаць сыну або дачцэ жывое адчуванне Бога, той непаўторны досвед, які чалавек перажывае, датыкаючыся да храма, багаслужэнняў, таінстваў. Я ўжо казаў, што розум дзіцяці больш успрымальны і адкрыты ўсяму, што прыходзіць звонку, таму бацькам так важна паспрабаваць укласці ў душу малога як мага больш светлага і добрага. У кожнага з нас свой шлях пазнання Бога, але калі сёння я магу зрабіць максімум для будучыні свайго дзіцяці, навошта адкладаць гэта на нявызначаны тэрмін? Духоўнае выхаванне дапаможа фарміраванню ў дзіцяці ўнутранага стрыжня, які па меры сталення не дасць яму прымаць няправільныя рашэнні і зберажэ ад памылак. Ужо сёння ваша дзіця можа далучыцца да Бога, правільна фарміравацца духоўна. І гэта, несумненна, дапаможа яму ў дарослым жыцці.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# «КАЛІ ЗБІРАЕЦЦА ЎСЯ СЯМ'Я, УСВЕДАМЛЯЮ, ШТО ЎЖО ДЗЯДУЛЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— А давайце ўспомнім, як прайшло ваша вяселле.***

**А. Ж.:** — На фоне складанага для кожнага чалавека і для ўсёй краіны часу. Прадукты і прамтавары па талонах, не заўсёды і не ўсюды своечасова выплачвалі заробкі, ды і якія яны былі... Але нам хацелася быць разам, хацелася зладзіць свята для сябе, родных і сяброў, і ў нас усё атрымалася. Вядома ж, на нашым вяселлі было шмат песень і музыкі.



Ірына і Алег разам 30 гадоў.

**«Музыка адыграла не апошнюю ролю ў тым, што паміж намі, як прынята казаць, прабегла тая самая іскра, з якой разгараецца каханне».**

**І. Ж.:** — У той час пасля падачы заявы ў загс давалі талоны на набыццё заручальных пярсцёнкаў. Мы тады жылі ў Рэчыцы, і ва ўнівермагу была спецыяльная секцыя для маладых. У ёй можна было купіць вясельную сукенку або тканіну на дзве сукенкі — тады ж была традыцыя два дні святкаваць вяселле. Жаніху прапаноўвалі касцюм, пару кашуль. Абутак таксама можна было там набыць... Дарэчы, з-за дэфіцыту тады былі такія прайдзісветы, якія падавалі заяву ў загс толькі дзеля гэтых талонаў, а шлюб у іх планы не ўваходзіў.

**А. Ж.:** — Не памятаю, каб мы моцна пакутавалі з-за гэтых цяжкасцяў. Неяк нават стараліся з гумарам паставіцца да сітуацыі. І потым, мы верылі, што наперадзе будзе лепшае жыццё. І не памыліліся.

***— Вы расказваеце дзецям аб сваёй маладосці?***

**А. Ж.:** —Так. Дзецям трэба ведаць гісторыю сям'і, пажадана не толькі бацькоўскай, але і некалькіх больш старэйшых пакаленняў. Тут, як і ў песні, галоўнае — абраць правільную танальнасць. Некаторыя бацькі, ведаю, расказваюць пра сваё юнацтва з такім пасылам: маўляў, нам было цяжка, а вы з нараджэння ў шакаладзе. Лічу, што гэта няправільна, дзеці не вінаватыя, што мы жылі ў іншы час. Мы расказваем з мэтай, каб яны ведалі, як было складана, маглі параўнаць з тым, што ёсць сёння, і шанавалі гэта. Нашы дзеці — гэта, мабыць, першае пакаленне, свядомы ўзрост якога прыпаў на паспяховы час, калі ўжо ёсць і спажывецкі дабрабыт, і шмат магчымасцяў для рэалізацыі сябе як асобы.

***— Казкі заканчваюцца вяселлем, а ў жыцці ўсё самае цікавае пачынаецца пасля. Як вы ладзілі сваё жыццё, дзе жылі?***

**А. Ж.:** — Пакуль не пабудавалі сваю кватэру, жылі разам з маімі бацькамі. Мы палічылі, што калі здымаць кватэру, то на жыццё амаль нічога не застанецца. Нам было камфортна, адчувалі падтрымку, асабліва калі нарадзіўся сын. Першы раз нават баяліся купаць дзіця — выдатна, калі побач бабуля, якая дапаможа, падкажа.

***— Вы планавалі нараджэнне дзяцей, наогул думалі, што іх будзе трое?***

**І. Ж.:** — Дзеці — гэта наша шчасце і радасць. Гэта ад Бога, мы нічога не планавалі. Старэйшаму сыну 30 гадоў, дачцэ — 23, а малодшаму сыну — 13. Дачка хацела яшчэ аднаго брацiка, увесь час казала нам пра тое, а мы абсалютна не гатовыя былі... Але, як той казаў, ніколі не кажы «ніколі»!

***— Бацькі дапамагалі вам з дзецьмі?***

**А. Ж.:** — Калі з'явіліся старэйшыя дзеці, бацькі яшчэ працавалі, таму такога класічнага варыянта, каб унукаў «падкінуць старым», у нас не было. Больш за ўсё ўвагі дзецям дарыла Ірына. У артыста заўсёды жыццё вандроўнае, а калі мяне запрасілі ў «Песняры», паездак стала яшчэ больш. Было няпроста, але ў нас усё атрымалася.

**І. Ж.:** — Паміж першым і трэцім дзіцем розніца ў 17 гадоў. Як за гэты час усё змянілася! З першым памперсы былі раскошай, з трэцім — звычайным расходным матэрыялам. Так што з кожным дзіцем было ўсё лягчэй і лягчэй у бытавых пытаннях.

***— Ірына, ці цяжка сумяшчаць клопат аб сям'і і работу?***

**І. Ж.:** — Для мяне важны дабрабыт сям'і, таму не ставіла сабе звышзадач у кар'еры. Але калі жанчына працуе, то развіваецца як асоба, заробак дае ўпэўненасць. Усё разам — гэта добры прыклад для дзяцей. Зрэшты, усе мы розныя і ў кожнай жанчыны свае акалічнасці ды сваё меркаванне на дадзены конт.

***— А як дзеці паміж сабой ладзілі, бо ў іх жа вялікая розніца ва ўзросце?***

**І. Ж.:** — Мне здаецца, у іх ідэальная розніца, калі старэйшы брат мог дагледзець малодшую сястру. А дачка вельмі клапацілася аб малодшым брацiку. І сёння дзеці дружныя.

***— Якіх прынцыпаў у выхаванні прытрымліваецеся?***

**І. Ж.:** — Перш за ўсё, іх трэба любіць. Дзіця, якому з маленства хапала бацькоўскай любові, вырастае шчаслівым, упэўненым у сабе. Дзецьмі трэба цікавіцца! І не паварахоўвай: якую адзнаку атрымаў? «Дзесяць» — малайчына, «сем» — дрэнна. Трэба распытваць, як прайшоў дзень, унікаць ва ўсё. Вельмі важна, каб паміж бацькамі і дзецьмі быў давер. Каб у сям'і былі свае жарты, якія разумееце толькі вы.

**«Нашы дзеці — гэта, мабыць, першае пакаленне, свядомы ўзрост якога прыпаў на паспяховы час, калі ўжо ёсць і спажывецкі дабрабыт, і шмат магчымасцяў для рэалізацыі сябе як асобы».**

**А. Ж.:** — Дзецям, вядома, трэба расказваць, што такое добра і што такое дрэнна. Але гэта толькі працэнтаў дваццаць, усё астатняе — асабісты прыклад. Дзеці лёгка счытваюць паводзіны бацькоў.

***— Чым займаюцца вашы дзеці?***

**А.Ж.:** — Старэйшы сын Антон — кампазітар. Ён яшчэ ў дзяцінстве заняў першае месца па вакале ў конкурсе, арганізаваным маэстра Міхаілам Фінбергам. Дачка Яніна таксама займалася ў музычнай школе, але прафесійны шлях выбрала іншы — вучыцца на псіхолага ва ўніверсітэце. Малодшы сын Уладзімір — школьнік і сур'ёзна займаецца футболам.

***— Вы неяк размяркоўваеце хатнія абавязкі?***

**І. Ж.:** — Калі Алег на гастролях, усё раблю сама, але часам далучаю дзяцей. Алег заўсёды імкнецца аблегчыць быт, ініцыіруе набыццё ўсялякай тэхнікі, якая дапамагае спраўляцца з хатнімі справамі.

**А. Ж.:** — Калі я дома, заўсёды ўсё робім разам. Нават стараюся нешта зрабіць «у запас».

***— Ёсць такая вядомая формула: заробак мужа — гэта сямейныя грошы, а заробак жонкі — гэта яе асабістыя сродкі. А якія фінансавыя правілы ў вашай сям'і?***

**А. Ж.:** — Усе грошы ідуць у сямейную скарбонку. Буйныя куплі заўсёды абмяркоўваем: што нам неабходна, што можа пачакаць. Заўсёды ў прыярытэце — здароўе, развіццё і адукацыя дзяцей, адпачынак.

***— Ці здараліся ў вашым жыцці нейкія казусныя гісторыі з прыхільнікамі «Песняроў»?***

**А. Ж.:** — У нас інтэлігентныя прыхільнікі і прыхільніцы. Цяпер ім не трэба стаяць каля службовага ўвахода ў канцэртную залу, каб паразмаўляць з артыстамі. Мы ўсе ў добрым сэнсе слова даступныя ў сацсетках.

**«Мы адчуваем сябе ўсё тымі ж маладымі людзьмі, якім усё цікава, лёгкімі на пад'ём. І толькі калі збіраецца ўся сям'я, усведамляю, што ўжо дзядуля».**

***— Як вы праводзіце водпуск?***

**А. Ж.:** — Мой водпуск чакае ўся сям'я, люблю рыбалку, а яшчэ шмат вандруем з жонкай. Нам цікава ўсё: і нейкая экзатычная краіна, і прыгожае месца ў Беларусі. Любім пазнавальны турызм, хоць можам правесці час і на пляжы.

***— У «Песнярах» нямала рыбакоў. Чаму гэты від вольнага часу такі папулярны ў артыстаў?***

**А. Ж.:** — Мусіць, таму што музыкантам часам трэба пабыць у цішыні.

***— Што б вы перанеслі ў сваё жыццё з вопыту сем'яў сваіх бацькоў і якія сямейныя традыцыі хацелі б захаваць у сем'ях вашых дзяцей?***

**А. Ж.:** — У сем'ях нашых бацькоў прынятая безумоўная павага да старэйшых. Вось што мы жадаем захаваць у сваёй сям'і і перадаць дзецям. Імкнёмся, але рэдка атрымліваецца сабрацца ўсёй сям'ёй. У нас ёсць традыцыя — смажыць бульбу на вячэру. Выглядае гэта так: хтосьці чысціць, хтосьці наразае, хтосьці смажыць, а потым садзімся за стол, ядзім, размаўляем, жартуем... І шчаслівыя ад таго, што мы — вялікая дружная сям'я, у якой пануе любоў!

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**
**Фота з асабістага архіва Алега ЖАЛЕЗНЯКОВА.**



Алег з сынам, нявесткай і ўнучкай.

## Колькі дзяцей у «Песняроў»?

— У нашым ансамблі сем музыкантаў, з іх шэсць — сямейныя мужчыны. На ўвесь калектыў — 14 дзяцей, найбольшаму — 30 гадоў, найменшаму — тры годзікі, — расказаў **Раман КОЗЫРАЎ, дырэктар — мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь БДА «Песняры».** — Ганаровы статус «дзядуля» (беларускага рока:)) мае толькі Алег Жалезнякоў!

**Фота: БДА «Песняры»** (*крыніца — pesnyary.by*)



# МУЖЧЫНСКАЕ ВЫХАВАННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Але якія б ні былі спартыўныя «прыбамбасы», самымі папулярнымі ў сям'і сталі мацаванне на сценцы прэса і выцісканне ад падлогі. Раней з цяжкасцю выціскаўся 15 разоў, а цяпер лёгка 25—30 разоў. За пяць гадоў выдатна змяніўся!

Мой падрослы хлопчык раней выконваў спартыўныя практыкаванні нібыта з-пад палкі. Цяпер ён адчуў, што сапраўды становіцца мацнейшы ды шырэйшы ў плячах, таму ўсё часцей самастойна займаецца фізічнай падрыхтоўкай.

Пятнаццацігадоваму юнаку прыемна адчуваць сябе дастаткова моцным чалавекам. Па прадметах у класе ў яго выключна 9 і 10, але назваць яго «батанам» наўрад ці хтосьці адважыцца. «Тата, твой спартыўны медаль быў не толькі тваёй узнагародай, але і маім маяком, дзякуючы якому я ўжо не хлюпік», — кажа сын.

## Мы самі з вусамі!

Я ўжо 27 гадоў як журналіст «Звязды». А раней скончыў тэхнічную ВНУ, працаваў інжынерам на радыёзаводзе. Займаўся зборкай тэлевізараў, быў прадпрымальнікам. Чаго толькі не рабіў у ліхія 90-я. Але ўменне майстраваць нешта рукамі ў пясок не сышло.

Доўгі час мы з жонкай жылі на здымных кватэрах, дзе ўвесь час усё ламалася. Тады «мужчыны на гадзіну» яшчэ не існавала, так што ўсё даводзілася рабіць самастойна.

**У нас была такая гульня, калі ён са сваім «кашальком» у выглядзе карткі накіроўваўся ў краму па бохан хлеба і пакет малака. Колькі гонару было ў такім паходзе!**

Калі мой малодшанькі стаў больш упэўнена хадзіць і ўсё браць у рукі — настаў час растлумачыць яму, што ў хаце ёсць малаткі і абцугі, і гэта выключна мужчынскія інструменты.

Але першымі прыладамі, з якімі сын старанна працаваў, былі нажніцы, клей, папера і фарбы. Тады мы разам збудавалі (склеілі і размалявалі) макет аўтобуса. Колькі намаганняў было прыкладзена, колькі спроб!.. Але гэта было вартае таго, бо аўтобус, зроблены ўласнымі рукамі, стаў найлепшай цацкай на пяць гадоў. Ды і цяпер ён яго не выкідвае.

Камусьці здаецца, што замена замкоў, водаправодных кранаў, падвешванне люстраў, укручванне лямпачак — задачы архіскладаныя, іх павінны выконваць спецыялісты. Аказваецца, не заўсёды. Нават калі вас ніколі і ніхто не вучыў тое рабіць, усё роўна можна і варта навучыцца. Інтэрнэт вам у дапамогу. Там усё падрабязна напісана, але... Без татавай падказкі і падтрымкі ў маленькага чалавека нешта наўрад ці атрымаецца.

Напрыклад, мой сын толькі паўгода таму навучыўся самастойна выкручваць і ўкручваць лямпачкі. Да гэтага існаваў нейкі жывёльны страх перад электрычнасцю. Цяпер ён дакладна ведае, што токам не стукне, калі механізм выключаны. У таты ёсць вальтметр (прыбор для вымярэння напружання і сілы току), якім і малады чалавек пачынае карыстацца. Ёсць дрыль, якая робіць дзіркі ў розных паверхнях. Ёсць пыласос. Пра гэтага «звера» гаворка асобная.

## Як гэта працуе?

У нашай сям'і мама падлогай не займаецца. Ёй хапае кухні.

Спачатку вільготнай прыборкай у хаце я займаўся з дзяўчынкамі, а калі хлопчык падрос, абавязак дапамагаць бацьку перайшоў да яго. Але тут паўстала праблема: аказваецца, пыласос гудзе, і страшна так гудзе. Ад чаго ён такі страшны?

Знаёмства сына з гэтай «гучнай пачварай» пачалося з таго, што я падрабязна растлумачыў яму, як пыласос працуе. Нават схему намаляваў (для нагляднасці), на пытанні адказваў. Нягледзячы на тое, «супрацоўніцтва» з пыласосам давалася з цяжкасцю.

Затое цяпер ён з ім на «адной хвалі», таму што ведае, як павялічыць (паменшыць) гучнасць. Што ад гэтага залежыць сіла ўцягвання паветра (змяняецца магутнасць агрэгата). Што калі хочаш пыласосіць доўга, але ціха, пераключаеш на мінімальную магутнасць. А калі хочаш хутка прыбраць — будзь ласкавы, трывай непрыемныя гукі. І яшчэ. Мы разам з сынам хадзілі і выбіралі механізм для вільготнай прыборкі памяшканняў. Спыніліся на адносна простай для нас, «прасунутых», разумнай швабры з распыляльнікам вады.

## Гульня ў «банкіраў» і не толькі

Цяпер мой сын — сучасны малады чалавек, які разумее ўсе тэхнічныя і



**Калі мой малодшанькі стаў больш упэўнена хадзіць і ўсё браць у рукі — настаў час растлумачыць яму, што ў хаце ёсць малаткі і абцугі, і гэта выключна мужчынскія інструменты.**

тэхналагічныя нюансы нашай кватэры. Ведае, дзе, за што і як мы павінны плаціць, і ўяўляе, як усім гэтым можна кіраваць. А ўсё пачыналася досыць даўно.

Тады банк прапанаваў аформіць бясплатную картку на дзяцей, якім менш за 14 гадоў. Такая картка прывязвалася да маёй і да майго разліковага рахунку. Потым я мог накіроўваць кішэнныя грошы са свайго «пластыку» на картку сына. У нас была такая гульня, калі ён са сваім «кашальком» у выглядзе карткі накіроўваўся ў краму па бохан хлеба і пакет малака. Колькі гонару было ў такім паходзе! Потым гульні сталі больш складанымі.

Я як сучасны гарадскі чалавек аплачваю кватэру (камунальныя паслугі), газ, ваду, электрычнасць, інтэрнэт і іншае праз інтэрнэт-банкінг на сваім тэлефоне. Але такі тэлефон (калі не лепшы) ёсць і ў майго сына.

Засталося толькі прывязаць яго картку да сістэмы банкінгу, атрымаць картку кодаў і аплачваць пастаянныя паслугі (у тым ліку школьнае харчаванне) з тэлефона сына. Я толькі накіроўваю крыху

**Інтэрнэт вам у дапамогу. Там усё падрабязна напісана, але... Без татавай падказкі і падтрымкі ў маленькага чалавека нешта наўрад ці атрымаецца.**

больш грошай на яго картку (гэта робіцца бясплатна ў сістэме АРІП), і ён можа аплачваць кватэру цалкам самастойна. Што і робіць.

Між іншым, у гэтых дзеяннях я бачу адразу некалькі станоўчых момантаў. Па-першае, сын ведае, што ён «у справах», што выконвае важную функцыю, без якой не абысціся. Па-другое, разумее, колькі каштуе кожная паслуга. Я нават падштурхоўваю сына аналізаваць зыходныя лічбы. Чаму ў гэтым месяцы мы больш плацім за ваду? Ці не таму, што сярэдняя дачка гадзінамі (і гэта не жарт) плёскаецца ў ванне? Чаму ў мінулым месяцы рахунак за электрычнасць у нас удвая большы, чым сярэдні? І гэтыя пытанні задае мой сын. Пытанні, на якія ён хоча чуць адказы. А мне прыемна адчуваць, як з дапамогай смартфона сталее хлопец. Развіваецца, а не дэградуе.

## Мама, бабуля, дзяўчына...

Мне здаецца, што толькі ад нас, татаў, залежыць стаўленне сына да процілеглага полу. Сын глядзіць на бацьку і ўсмоктвае ўсё, як губка.

Мая маці для дзяцей — бабуля. Яна ўжо досыць пажылы чалавек — 85 з маленькім «хвосцікам». Калі не звяртаць увагу на зморшчыны на яе твары, яна вельмі светлы чалавек і... малады. Я лічу яе такой, таму што яна мая мама. Яна ведае амаль усе прыказкі свету, урыўкі вершаў многіх аўтараў. Яна распавядае пра сваё юнацтва — як вучылася ў ВНУ ў Маскве, як хадзіла сустракаць Гагарына на Красную плошчу. Гэта не проста жыццё асобнага чалавека, гэта цэлая гісторыя сям'і.

Мае дзеці бачаць, як я стаўлюся да сваіх бацькоў, як пяшчотна гляджу на сваю маму. Нягледзячы на ўласныя клопаты, абавязкова прыязджаю на малую радзіму на выхадныя і ў адпачынак.

І яшчэ. Я ніколі не дазволіў сабе грубага слова або павышанага тону ў дачыненні да сваёй жонкі. Я не маю на гэта права, бо яна — маці маіх дзяцей. Я тлумачу свайму сыну, што трэба гэтак жа ставіцца да іншых жанчын і дзяўчат, якія некалі стануць бабулямі і матулямі...

Спадзяюся, што сын у нас вырасце добрым чалавекам. Ужо амаль вырас. Ён браў і будзе браць прыклад з мяне, як у свой час я браў прыклад са свайго бацькі. А ён заўсёды любіў сваю Святлану...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Нялішнія парады

- Вылучайце станоўчыя якасці будучых джэнтльменаў, напрыклад: уважлівасць, добразычлівасць і смеласць.
- Заўсёды кажыце юнаму чалавеку, што верыце ў яго, што ў яго ўсё атрымаецца, хваліце яго не толькі за бліскучыя вынікі, але і за намаганні, нават калі яны пакуль не ўвянчаліся поспехам.
- Далучайце хлопчыка да вашых каштоўнасцяў, дазваляйце яму інтэрпрэтаваць іх па-свойму. Ён — будучы мужчына і будзе рэагаваць на эмацыянальныя сітуацыі не так, як гэта робіце вы (гэта для мам).
- Калі ваша дзіця актыўнае, устанавіце ў яго пакоі перакладзіну для падцягвання. Фізічныя практыкаванні вельмі карысныя і важныя для ўсіх дзяцей, а для хлопчыкаў яны яшчэ і неабходныя, каб «выпусціць пару», даць выхад празмернай энергіі.
- Хлопчыкам неабходныя зносіны з мужчынамі, але абавязкова — з бацькам. Падтрымлівайце актыўную мадэль паводзін вашага дзіцяці, бо менавіта актыўнасць з'яўляецца вельмі важнай яго рысай.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

### Дазваляйце рабіць памылкі

Часам бацькі ў імкненні да ідэалу, жадаючы падаслаць пярыну ўсюды, дзе толькі можна, не даюць свайму сыну магчымасці прымаць самастойныя рашэнні і зводзяць практычна да нуля магчымасць здзейсніць памылку. Гэта пагібельна для фарміравання здаровай асобы, паколькі памылкі — неад'емная частка вопыту. У выніку з-за такіх падыходаў вырастаюць падлеткі, за якіх усё вырашаюць бацькі, і ім нават няма чаго хацець. Калі дзіця пазнае свет, так ці інакш яно будзе памыляцца. Падумайце, перш чым сварыцца з-за запэцканых штаноў ці пабітай машынкі. Давайце хлопцу магчымасць праяўляць ініцыятыву і напрацоўваць свой вопыт.

### Дайце адносную свабоду

Адмоўцеся ад «ручнога кіравання» і дробязнага кантролю. Не імкніцеся пранікаць ва ўсе сферы жыцця сына і кантраляваць кожны яго крок. Пакідайце яму магчымасць самому арганізаваць хоць бы малую частку свайго жыцця. Вызначыцеся, за што ў сваім жыцці ён нясе адказнасць. Што ёсць на яго тэрыторыі, што адносіцца толькі да яго і не ўплывае на вас. Дэлегуйце гэта, не ўмешвайцеся. Нават у самага маленькага чалавека можна знайсці такую прастору, дзе ён сам здольны наладзіць працэсы.

### Ацэньвайце ўчынкі, а не асобу

Большасць бацькоў блытае ацэнку ўчынкаў і ацэнку асобы. Гэта вельмі ўскладняе выхаванне дзіцяці любога полу, але асабліва хлопчыкаў. Важна разумець, што ацэнка асобы — вораг дзеяння. Такімі ацэнкамі, як «шалапут», «гультай», «двоечнік» ці нават «геній» і «чэмпіён», бацькі могуць загубіць унутраны маторчык стваральнай дзейнасці. У дзіцяці фарміруецца перакананне, што ён такі і гэта назаўжды.

### Заахвочвайце дзеянні і выніковасць

Адзначаючы вынікі, пазбягайце залежнасці дозы вашай любові ад колькасці дасягненняў або памылак. Любіце яго заўсёды, не пазбаўляйце яго душэўнай блізкасці толькі таму, што ён «хадзіў на галаве» за школьнай агароджай. Гэта якраз той выпадак, калі катлеты і мухі — паасобку.

### Будзьце сумленныя

Не хавайце ад сына свае памылкі. Тады ён з дзяцінства засвоіць, што памылкі — частка сталення. Яны вучаць адказнасці за наступствы ўласных дзеянняў. Заўсёды можна заставацца добрым чалавекам, нават калі памыліўся. Усё можна выправіць.

Самае галоўнае і самае складанае — зразумець, што вы ўплываеце на сына не толькі выхаваўчымі прамовамі, але і сваімі ўчынкамі. Калі дарослыя людзі самі не навучыліся несці адказнасць за наступствы сваіх дзеянняў, дараваць сабе памылкі і здабываць з іх урокі, любіць і выхоўваць сябе, то вельмі складана будзе выхаваць гэта ў сыне.

# ДЖЫН ПА ІМЕНІ ГОША

Іна была як на іголках — час выязджаць, а Гошы няма. Не выпіў бы... За падпрацоўку грошы атрымлівае сёння. А калі ў Гошы з'яўляюцца грошы, у яго ўсяляецца злёгку «крануты» Джын. «Не з'явіцца — пакіну на стале білет і паеду, — злавалася Іна. — Захоча — прыедзе. Не пазбаўляць жа дзяцей адпачынку з-за яго выкрутасаў».

Сабралася выходзіць, і тут уляцеў ускудлачаны Гоша. «Джын ужо ўсяліўся, — засумавала Іна. — Пуцёўкі згараць, не пакідаючы кватэры».

«Я не еду!» — ускінуў падбародак муж, і нешта бліснула ў яго вачах. «Куражыцца», — зразумела Іна. Спрачацца не было сэнсу, а ўгаворваць — часу. Мяркуючы па выглядзе Гошы (з кішэняў джынсаў і кашулі выглядваюць пачкі грошай), Джын адрываецца па поўнай праграме: «Глядзіце! Гоша — мільянер!»

Цяпер галоўнае — сесці ў цягнік, інакш прападуць пуцёўкі, выдзеленыя ёй на рабоце за палову кошту, і адпачынак цю-цю... Іншай магчымасці вывезці некуды дзяцей не будзе яшчэ пару гадоў. Наклёўвалася два варыянты: быць цярплівай або ўзяць з сабой суседку Зою Піліпаўну — яна лёгкая на пад'ём і дапаможа дзяцей дагледзець.

«Я не паеду!» — Гоша дэманстратыўна разваліўся на канапе. Джын, які сядзеў у Гошы, задзіраўся, чакаў скандалу, просьбаў.

Іне стала брыдка і, у думках паслаўшы Гошу з Джынам падалей, яна паклікала суседку. Тая адразу паставіла ўльтыматум: «Гоша, калі ты не паедзеш, я за пятнаццаць хвілін збяруся. Навошта пуцёўку страчваць?»

«Я еду, — агрызнуўся Гоша. — Выклікай таксі!» Казаць, што да вакзала на тралейбусе дзесяць хвілін, — стапрацэнтны скандал. Зоя Піліпаўна паўздыхала і дапамагла знесці сумкі да машыны, пры гэтым шапнула Іне: «Пацярпі, у цягніку праспіцца».

«Сумкі ў багажнік, дзяцей і бабу на задняе сядзенне!» — скамандаваў Гоша, уладкоўваючыся на пярэднім месцы.

Ён акінуў позіркам двор, шукаючы гледачоў, але, акрамя Зоі Піліпаўны, нікога не было. «Вось дваццатка, і я буду курыць у машыне», — сказаў ён таксісту. Але той адсунуў грошы: «Нельга, у машыне дзеці». Іна бачыла, як грэбліва скрывіліся ў таксіста вусны: пабачыў ён усялякага на сваёй рабоце.

Дзеці прытуліліся да маці, баючыся, што тата пачне крычаць, і яны нікуды не паедуць. «Яшчэ дам! — горда заявіў Гоша і дастаў пачак грошай з кішэні. — Колькі?» Таксіст у знак адмовы пахітаў галавой. «Табе што, грошы не патрэбныя?!» — Гоша пачаў нарывацца...

Невядома, чым бы скончыўся інцыдэнт, калі дарога была б больш доўгай, але яны пад'ехалі ўжо да вакзала. Таксіст выставіў на тратуар сумкі і не ўзяў у Гошы чаявых, чым вельмі яго раззлаваў. Гоша даў штурхаля ад'язджаючай машыне, нага слізганула па колу, з-за чаго Гоша ледзь не ўпаў і злосна вылаяўся.

«Бяры сумкі, я табе не насільшчык, — рыкнуў ён на Іну. — А наогул, я перадумаў. Не еду». І Гоша растаў у прывакзальным натоўпе. Іна трохі разгубілася, але наўючыла на сябе паклажу, загадала дзецям трымацца за сумкі і рушыла да табло. Іх цягнік ужо стаяў на пуцях. «Лепш хай прападзе адна пуцёўка, чым чатыры», — вырашыла Іна і пайшла да цягніка. Прымірыўшыся з тым, што яны з'язджаюць без Гошы, яна адчула палёгку.

«Мама, я бачыла тату тут, — Алёнка паказала ў натоўп. — Ён глядзеў на нас». «Цікавіцца, як цягну сумкі, — адзначыла Іна. — Чакае, што буду плакаць. Ды гары ты гарам! Без цябе спакайней будзе!» Яна адчула гідлівасць і жаданне ніколі яго не бачыць.

Ішла пасадка пасажыраў, толькі дзверы іх вагона былі зачыненыя, праваднік кудысьці знік, пасажыры хваляваліся на платформе. Тым часам Гоша, як паўлін, адтапырыў хвост і выпінаў грудзі, — яго цешыла ўвага. Людзі затрымлівалі на ім погляд, асабліва на кішэнях.

Іна нервавалася: «Хутчэй бы адчынілі дзверы». Гоша, мабыць, шукае іх. Яна ўжо горача жадала, каб ён не паехаў з імі. Да адпраўлення заставаліся хвіліны, калі адчыніліся дзверы вагона і народ хіснуўся ў бок уваходу.

І тут яна ўбачыла Гошу. Ён бег ад галавы цягніка і зазіраў у вокны вагонаў. «Ага, спалохаўся, што не знойдзе нас, бо спытаць нумар вагона не знайшоў часу, — падумала Іна. — Значыць, яму яшчэ не ўсё абыякава». Яна з цікаўнасцю глядзела на мужа — да гэтага часу не бачыла яго такім устрывожаным.

«Без мужа едзеш! Гуляшчая...» — паток брудных слоў прымусіў натоўп азірнуцца на чалавека ў жоўтай кашулі і на Іну. «Мужчына, адчапіцеся ад нас, а то міліцыю паклічу», — сказала Іна яму, бы незнаёмаму. Яе прапусцілі, праваднік дапамог дзецям падняцца ў тамбур.

Яна хутка прайшла ў купэ, загадала дзецям: «Пакуль цягнік не кранецца — у вокны не выглядвайце». Вакзал павольна паплыў міма. «Дзякуй Богу, — сказала Іна. — Едзем».

Пастукаў праваднік:

— Вашы квіткі?

Іна працягнула тры.

караскацца на верхнюю паліцу?!» Пашумеўшы яшчэ, ён паставіў Іне ўльтыматум: «Тады я іду да цябе на паліцу». Адмова раз'юшыла Гошу настолькі, што суседзі зноў паклікалі праваднiка. Гоша схаваўся ў прыбіральні.

Раніцай перш за ўсё Гоша забраў у дзяцей падораныя грошы: «Я гаспадар сваім грашам, захачу — дам, захачу — узяў. Я ў рэстаран!» «Вазьмі Алёнку, хай супчыку паесць, — папрасіла Іна. — А потым мы з Волечкай сходзім». Алёнка паслухмяна ўстала і пайшла з татам у рэстаран, а Іна стала карміць трохгадовую Волечку.

Алёнка вярнулася з татам з рэстарана ў захапленні: «Мама, нашага тату ўсе ў рэстаране ведаюць! Усе завуць яго Гошам. І мне цётка цукерак дала». Гоша хмыкнуў і зноў змыўся ў напрамку рэстарана. З'явіўся апоўдні, у самую спякоту. Вагон проста плавіўся ад духаты. Іна пасадзіла дзетак на крэсельцы, якія адкідваліся, у калідоры, там з адкрытых фортак дзьмуў ветрык.

Гоша заваліўся спачатку на ніжнюю паліцу і захроп, потым зваліўся на падлогу галавой да дзвярэй. Іна паднялася прыкрыць дзверы, каб не прыцягваць вачэй жоўтая кашуля.




— Жанчына, гэта ў вас ёсць чацвёрты білет? — спытаў праваднік. — Ваш муж просіць, каб я ўпусціў яго.

— Няма, — схлусіла Іна. — І ён мне не муж. Не пускайце яго, а то спакою нікому не будзе.

— Ён абяцае паводзіць сябе ціха, — запэўніў праваднік. — Давайце яго пусцім.

«Ужо заплаціў правадніку», — здагадалася Іна.

Праз хвілін дзесяць з хуткасцю выпушчанай стралы ў купэ ўляцеў Гоша. Яго словы не паспявалі за наплывам пачуццяў: «Гадаўка, гадаўка, гадаўка, дурніца..., — кожная абраза паўтаралася трохразова, як на пласцінцы, якую заела. — Хацела без мяне з'ехаць?!» Іна моўчкі глядзела ў акно, дзеці зашыліся ў кут. Нешта сказаць — значыла падліць масла ў агонь.

Запас слоў не можа быць бясконцы, а Гоша выступаў ужо больш за паўгадзіны. Трымаўся за кошт паўтораў. Ужо ў соты раз ён паўтараў «гадаўка», напэўна, лічыў гэтае слова ёмістым. Каб шыкануць яшчэ раз, дастаў пачак грошай з кішэні і працягнуў Волечцы: «Вазьмі, доча, грошыкі, гэта тата зарабіў. Ягадак сабе купіш. Гэтая гадаўка не купіць».

У суседніх купэ пасажыры пачалі стукаць у сцяну і скардзіцца правадніку. Нарэшце Джын, які ўсяліўся ў Гошу, пачуў слова «міліцыя», і Гоша схаваўся ў прыбіральні. Праваднік з міліцыянерам пагутарылі з ім праз зачыненыя дзверы і супакоіліся прымірэнчым штрафам. А Гоша пайшоў у вагон-рэстаран.

Вярнуўся ён апоўначы. Дзеці спалі на ніжніх паліцах, і гэта яго абурыла: «Я што, буду

З другога купэ выглянула пажылая жанчына:

— Гэта ваш шумеў ноччу? А куды вы з ім едзеце?

— У санаторый, — адказ прагучаў анекдатычна.

— Што вы там з ім рабіць будзеце? Ён жа вас даканае! — ахнула жанчына.

— Хутка супакоіцца — грошы скончацца.

— У вас жа дзеці. Кідайце яго і ўцякайце, — жанчына была ў шоку.

— Не магу, жывём у кватэры ад яго работы. Адна з дзяцей не выцягну...

Пасажыры глядзелі на Іну са шкадаваннем, а яна ад сораму гатовая была праваліцца скрозь зямлю.

...Раніцай мужчыны і жанчыны з суседніх купэ прыйшлі правесці Іну. Яна сабрала дзяцей і рэчы. Гоша не спяшаўся. Ён ужо працверазеў і быў у добрым настроі.

Мужчыны падняў сумкі, жанчына падхапіла на рукі Волечку, а Іна ўзяла Алёнку. Гоша ішоў апошнім, на ім былі ўсё тыя ж жоўтая кашуля і джынсы. Затое ён меў выгляд арла, які аглядае стэп з нябёсаў...

Потым, калі цягнік ужо кранаўся, пасажыры пасталі каля акна і глядзелі на сям'ю, якая адыходзіла: на жанчыну з торбамі, на дзяўчынак, якія беглі побач. Гоша павярнуўся і здзекліва памахаў рукой вагонным спадарожнікам.

— Як яна можа з ім жыць? — абурылася адна з жанчын.

— Каб ты спатыкнуўся! — пажадала іншая.

— Не арол, — у задуменні прамовіў мужчына. — Так... Верабей абскубаны...»

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

Смехатэрапія

## Яны такія розныя...

*Мара жанчыны: выйсці з вялікім пакетам з ювелірнай крамы, а не з прадуктовай.*

***

*Каб спадабацца жанчыне, шмат не трэба. Проста падыдзі і спытай: «Я не зразумеў, ты пахудзела ці што?»*

***

*Жанчына выходзіць замуж з надзеяй, што мужчына зменіцца. А ён не змяняецца. Мужчына жэніцца з надзеяй, што жанчына не зменіцца. А яна змяняецца. Дзе справядлівасць?!*

***

*Мужчына, які дабіўся поспеху, — гэта той, хто зарабляе больш, чым можа патраціць яго жонка. Жанчына, якая дабілася поспеху, — тая, якая знайшла такога мужчыну.*

***

*Гінеколаг — гэта чалавек, які шукае праблемы там, дзе іншыя шукаюць задавальненне.*

***

*Пажылая пара сядзіць на пляжы, і муж увесь час разглядае маладых дзяўчат.*
*— Дарагі, прыкрый вочы і падбяры слюні — гэты дэсерт ужо не для цябе!*
*— Сонейка, калі я на дыеце, можна хоць бы пагартаць меню?*

***

*— Мужчына, прыбярыце свае думкі ад майго цела!*

***

*— Як вам новая мода ўдзельнічаць у родах?*
*— Даруйце, мне больш падабаецца ўдзельнічаць у тым, што папярэднічае цяжарнасці...*

***

*Старасць — гэта калі дзяўчаты прыязджаюць да цябе на машыне з чырвоным крыжам.*

***

*«Зрабіце твар прасцейшым!» — папрасіла пластычнага хірурга доктар філасофскіх навук, якая стамілася ад адзіноты.*

***

*Самы кароткі шлях ад кахання да нянавісці часам пралягае праз загс.*

***

*Развітваючыся, абое плакалі: ён ехаў у працоўную камандзіроўку на поўнач, яна — да мамы ў вёску... Сустрэча была нечаканай — праз тры дня на пляжы ў Егіпце.*

***

*— Мы з табой ужо дзесяць гадоў у шлюбе. Скажы шчыра, ты мне хоць калі-небудзь у думках здраджвала?*
*— Шчыра? У думках — ніколі!*

***

*У мужчынскім слоўніку павінны быць тры галоўныя словы: кахаю, куплю, паедзем.*

***

*Усё, што робіць жанчына ў хаце, — незаўважна. Заўважна, калі яна гэтага не робіць.*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Подмости, инв. № 1273; Подмости шарнирные, инв. № 1444; Подмости шарнирные, инв. № 1447; Подмости шарнирные, инв. № 1699; Подмости шарнирные, инв. № 1445; Подмости шарнирные, инв. № 1448; Подмости шарнирные, инв. № 970; Подмости шарнирные, инв. № 971; Подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000А (с настилом), инв. № 1247; Подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2392; Подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2393; Подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2394; Подмости шарнирные, инв. № 967; Подмости, инв. № 1272 | 825,60 | 82,56 | 41,28 |
| 2 | Пластиковый контейнер на 1000 л, б/у, 3 шт.; Емкость пластиковая 1000 л, 1 шт.; Емкость пластиковая 1000 л, 2 шт.; Емкость пластиковая 1000 л, 2 шт. | 105,60 | 10,56 | 5,28 |
| 3 | Электронасос «Гном» 6-10 Д 220В, инв. № 2822; Насос «Бурун» Н1ВБ2,5/2 380В +Н1В2,5/2 «Бурун Обойма» 23ТНП12 000,011, инв. № 2682 | 54,00 | 5,40 | 2,70 |
| 4 | Фундамент Ф-1; Двухконусный блок 30*30 Н300, 2 шт.; ПДн 10, 6 шт.; ПДн 10 | 36,02 | 3,60 | 1,80 |
| 5 | Кузов К-375, инв. № 204; Кузов К-375, инв. № 112; Инструменталка, инв. № 372; Кузов-375, инв. № 64; Кунг, инв. № 1744 | 207,60 | 20,76 | 10,38 |
| 6 | Инструменталка, инв. № 744 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 7 | Кунг автомобильный, инв. № 1101 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 8 | Инструменталка, инв. № 747 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 9 | Инструменталка, инв. № 1788 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 10 | Инструменталка, инв. № 613 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 11 | Кунг-бытовка, инв. № 509 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 12 | Инструменталка/Склад для инструмента № 7/, инв. № 2459 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 13 | Блок-контейнер, инв. № 493 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 14 | Инструменталка, инв. № 503 | 120,00 | 12,00 | 6,00 |
| 15 | Блок-контейнер «В», инв. № 601 | 72,00 | 7,20 | 3,60 |
| 16 | Блок-модуль CU-85, инв. № 845 | 49,20 | 4,92 | 2,46 |
| 17 | Инструменталка, инв. № 1103 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 18 | Кунг-бытовка, инв. № 510 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 19 | Кунг К-375 отразд\РЛ 35\, инв. № 310 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 20 | Инструменталка, инв. № 924 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 21 | Вагон-бытовка, инв. № 1992 | 120,00 | 12,00 | 6,00 |
| 22 | Холодильник «Атлант» МХМ-2835-90, инв. № 2776; Холодильник-морозильник ХМ-4012-000 РБ, инв. № 1339; Холодильник МРМ-46-CJ, инв. № 2480; Холодильник «Атлант»-морозильник ХМ-4010-022, инв. № 2775; Печь микроволновая «Горизонт» 20MW700-1378B, инв. № 12718; Холодильник МХ-2823-80, инв. № 609; Холодильник МХМ 2808-97, инв. № 1878; Холодильник МХ М2706-80, инв. № 674 | 110,28 | 11,03 | 5,51 |
| 23 | Поддон 800*1200 П4, 20 шт.; Поддон трансп.1200*1000*120, 5 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 1 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 11 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 10 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 9 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 10 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 9 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 3 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 25 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 13 шт.; Поддон 800*1200 2ПО4, 2 шт.; Поддон 2П04, 2 шт.; Поддон 2П04, 7 шт.; Поддоны ПКП-78ц1, 14 шт.; Поддоны ПКП-78ц1, 8 шт. | 436,86 | 43,69 | 21,84 |
| 24 | Отвод 90 гр. сварной ПЭ100 110 SDR17, 1 шт.; Труба ПЭ100 SDR 17-110*6.6 питьевая, 22 м. п.; Отвод НПВХ 110*87,5 наружная канализация, 2 шт.; Труба ПЭ100 SDR 17-800*47,4 питьевая L12, 8,19 м. п.; Редукция внутр. 110*50, 4 шт.; Тройник ПВХ ВК 50-50-45, 2 шт. | 1 242,72 | 124,27 | 62,14 |
| 25 | Форма 2 ФК 70, 2 шт.; Форма куба 2ФК100, 2 шт.; Электрообогреватель 2кВт (9 секций), 1 шт.; Огнетушитель ОП-4, 2 шт.; Огнетушитель ОП-4, 1 шт.; Огнетушитель ОП-4, 1 шт.; Электрод МР-3 5 кг, 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Стойка металлич., 6 шт.; Связь 3.05м ЛСПР-200, 3 шт.; Связь горизонтальная дл=3000 мм, 9 шт.; Связь диагональная дл=3000 мм, 9 шт.; Головка муфтовая соединительная напорная ГМН -50, 1 шт.; Стартер S2-4-22Вт 110-240В, 13 шт.; Электропривод ЭКП-1300 (220), 2 шт.; Транс. ТМТО-80/0.38 Ун/Д/Д-11, 1 шт.; Трансформ. ТМТО-80/0.38 Ун/Д/Д-11-11 У1, РБ, 2 шт.; Дюбель быстрого монтажа с гвоздевым шурупом, потай, п/п, 6*80 (упак./100 шт.), 0.1 упак.; Распорка TRIO MR 650/862, 2 шт.; Вентилятор напольн., 1 шт.; Аппарат телефонный «Люкс 301-1 РБ», 1 шт.; Холодильник МХ 365-00 РФ, 1 шт.; Калькулятор 12-разр. CITIZEN, 1 шт.; Ножовка по дереву 450 мм, 2 шт.; Резак пропановый РЗП-02М, 1 шт.; Огнетушитель ОП-4(3)миг, 2 шт.; Калькулятор CITIZEN SDC 664, 1 шт.; Калькулятор 12-разр. CITIZEN, 2 шт.; Калькулятор CITIZEN SDC 664, 1 шт.; Огнетушитель ОП-4/3, 2 шт.; Огнетушитель ОП-4, 1 шт.; Огнетушитель ОП-8(з) АВСЕ, 2 шт.; Огнетушитель ОП-8(з) АВСЕ, 2 шт.; Шкаф металлический для одежды, 12 шт.; Калькулятор CITIZEN SDC 888 XBL, 1 шт.; Огнетушитель ОП-4(3)миг, 2 шт.; Баллон углекислотный, 1 шт.; Вентилятор напольн., 3 шт.; Лопата совковая цельнометаллическая, 1 шт.; Баллон кислородн., 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 3 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Электрочайник Midea MK-8034, 1 шт.; Эл. чайник POLARIS, 2 шт.; Каска защитн. «Лидер» белая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» белая, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт.; Тел. а/п Panasonic, 4 шт.; Тел. аппар. Panasonic, 1 шт.; Тел. аппар. Panasonic, 2 шт.; Тел. аппарат «Евротеф-207», 1 шт.; Телефон Panasonic KX-TS2350ru 2350, 1 шт.; Шкаф метал. /сейф/, 1 шт.; Кастрюля 3 л, 1 шт.; Часы настенные эл.-мех. 1Б6, 2 шт.; Часы настенные эл-мех. 1Б6, 1 шт.; Обогреватель масляный, 1 шт.; Сейф, 1 шт.; Сейф метал. 700*450*350/, 1 шт.; Лом пожарный легкий, 2 шт.; Багор пожарный разборный, 2 шт.; Багор пожарный разборный, 2 шт.; Огнетушитель ОП-45 (з), 6 шт.; Радиатор масляный электрич. (2000 Вт, 11 секций), 3 шт.; Удлинитель 4 мест 30с/з ПВС 3*1,5, 1 шт.; Электропривод ЭКП-1300 (220), 2 шт.; КТР в ком. в изол. Ду50 (59-63 мм) 2" М8/100, 10 шт.; Стартер S2-4-22Вт 110-240В, 13 шт.; Дюбель быстрого монтажа с гвоздевым шурупом,потай, п/п,6*80 (упак/100 шт), 0.1 упак.; Лампа накаливания Б 60 Вт Е27, 4 шт.; Доводчик дверной, 1 шт.; Кронштейн подмостей, 22 шт.; Подкос 2-уровневый, 18 шт.; Баллон кислородн., 1 шт.; Баллон бытовой 50 л, 1 шт.; Баллон кислородн., 1 шт.; Опалубка Панель TR/4 330*90, 2 шт. | 4 239,63 | 423,96 | 211,98 |
| 26 | Отводы стал. крут. шов. 90гр Ду 15 (Дн 21,3*2,2), 2 шт.; Фланцы ст Ру 16 Ду-300, 1 шт.; Отводы стал. Дн 57, 7 шт.; Отводы стал. крут. шов. 90гр Ду 15 (Дн 21,3*2,2), 2 шт.; Фланцы ст Ру 16 Ду-300, 1 шт.; Пистолет заклепочный, 1 шт.; Гайка оцинкованная d=90 двухрожковая, 55 шт.; Труба эл/св 7306 Марка-20 Типоразмер – 89,0*3,0, 1.35 тн; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт. | 775,14 | 77,51 | 38,76 |
| 27 | Форма ПН 10, 1 шт.; Форма ПН 10, 1 шт. | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 28 | Перфоратор BOSCH GBH 4-32 DFR в чем., 1 шт.; Углошлифмашина GWS 15-125 CIE, 1 шт.; Пила циркулярная GKS 65 CE, 1 шт.; Шлифмашина ленточная MAKITA 9403, 1 шт.; Аккум. дрель-шуруповерт BOSCH GSR 120 -Li в чемодане, 1 шт.; Аккум. дрель-шуруповерт 6337 DWDE 14.4В (проф. чемодан, 2 Ni-Mg аккум., зарядное устр-во, бита), 1 шт.; Перфоратор MAKITA-2450, 1 шт.; Щетка для подметания, 2 шт.; Лопата снеговая с черенком, 1 шт.; Ножницы по металлу 300 мм, 1 шт.; Кувалда 4,0 кг с деревянной рукояткой STARTUL MASTER, 1 шт.; Уровень 1000 мм 2 глазка, 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 1 шт. | 865,32 | 86,53 | 43,27 |
| 29 | Перфоратор GBH 4-32 DFR, 1 шт.; Перфоратор GBH 7-46, 1 шт.; Углошлифмашина BOSCH GWS 20-230, 1 шт.; Циркулярная пила GKS 55, 1200 Вт, 55мм, 1 шт.; Шлифмашина эксцентр. BOSCH GEX 125 AC, 1 шт.; Шуруповерт аккум. GSR 12V, 1 шт.; Электродрель, 1 шт.; Дрель-шуруповерт KRESS 500 BS, 1 шт.; Аккум. шуруповерт., 1 шт.; Углошлифмашина GWS 11-125, 1 шт.; Метла синтетическая с черенком, 1 шт.; Щетка для подметания пола «Джексон», 1 шт.; Уровень 600 мм 2 глазка, 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная «Исток», 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт.; Каска защитная, 1 шт. | 948,12 | 94,81 | 47,41 |
| 30 | Полка навесн. 1394/369/328, 10 шт.; Зеркало, 5 шт.; Шкаф платяной /орех/, РБ, 2 шт. | 375,30 | 37,53 | 18,77 |
| 31 | Мачта осветительная ML 440 (без электрогенератора MG5), 2 шт.; Электрогенератор MG5, 1 шт.; Каска защитн. «Лидер» оранжевая, 18 шт. | 2 456,52 | 245,65 | 122,83 |
| 32 | Видеокамера DS-2DE 4220-AE, 1 шт.; Видеокамера DS-2DE 4220- AE, 1 шт. | 372,00 | 37,20 | 18,60 |
| 33 | Фиксатор «Опора» 50/45/40/35 (упак. 250 шт.), 12 упак.; Фиксатор «Конус» (1000 шт.), 0.29 упак.; Фиксатор «Звездочка» 25.6-20 /1000 шт., 0.22 упак.; Тент «Тарпикс 180», 10 м х 15 м, 180 г/м$^2$, 1 шт.; Блоки ячеистые 1 категории D500, 0.1 куб. м; Плита П15д-8, 1 шт.; Термоусаживаемая трубка ТУТ 10/5 черная, 5 м; Термоусаживаемая трубка ТУТ 20/10 черная, 5 м; Термоусаживаемая трубка ТУТ 6/3 черная, 5 м; Термоусаживаемая трубка ТУТ 8/4 ЧЕРНАЯ, 5 м; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт.; Каска защитн. «Исток», 1 шт. | 178,24 | 17,82 | 8,91 |
| 34 | Аппарат стыковой сварки Deita 500 в комплекте с вкладышами д. 280-450, инв. № 2113 | 23 112,00 | 2 311,20 | 1 155,60 |
| 35 | Затирочная машина TIFON 900H (900 мм Enar) с диском 900 (с лопастями), инв. № 2630 | 1 368,00 | 136,80 | 68,40 |
| 36 | Затирочная машина TIFON600H (600 мм Enar) с диском 600 (с лопастями), инв. № 2629 | 1 152,00 | 115,20 | 57,60 |
| 37 | Нагреватель переносной дизел. Master BV 170e, инв. № 2034 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 38 | Выпрямитель ВД -401УЗ, инв. № 1343 | 525,60 | 52,56 | 26,28 |
| 39 | Нагреватель переносной дизел. Master BV 170E, инв. № 2033 | 1 152,00 | 115,20 | 57,60 |
| 40 | Нагреватель переносной дизел. Master BV 290 E /непрям/, инв. № 2232 | 1 512,00 | 151,20 | 75,60 |
| 41 | Емкость для воды передвижная, инв. № 1015 | 698,40 | 69,84 | 34,92 |
| 42 | Устройство многофункциональное Canon IR 2025, инв. № 1607 | 547,20 | 54,72 | 27,36 |
| 43 | Захват для кровельных сэндвич-панелей ТГ-СПК-0,3, 4 шт. | 1 036,80 | 103,68 | 51,84 |
| 44 | Нагреватель переносной дизел. Master BV 290E, инв. № 1624 | 1 512,00 | 151,20 | 75,60 |
| 45 | Нагреватель переносной дизел. Master BV 170E /непрям/, инв. № 2231 | 1 152,00 | 115,20 | 57,60 |
| 46 | Инструменталка /Склад для инструмента № 6/, инв. № 2458 | 309,60 | 30,96 | 15,48 |
| 47 | Инструменталка, инв. № 1706 | 410,40 | 41,04 | 20,52 |
| 48 | Теодолит, инв. № 614 | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 49 | Нивелир 442 Кл, инв. № 498 | 604,80 | 60,48 | 30,24 |
